

Беспілотнік шукае самагоншчыкаў.

СТАР. 2



Пра што жартуе радыёвядучы Юрый Цароў?

СТАР. 3



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень.

20 КАНАЛАЎ

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 КАСТРЫЧНІКА 2013 г. ПЯТНІЦА № 192 (27557) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ПРАВА ВЫБАРУ

## Парадак прыпынення дзейнасці ў сувязі з доглядам дзіцяці да 3 гадоў вызначыць Саўмін

Каментуючы карэспандэнту **БЕЛТА** ўказ № 462 «Аб некаторых пытаннях назначэння і выплаты дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей», які 9 кастрычніка падпісаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, **намеснік начальніка аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Марына АРЦЁМЕНКА** сказала, што мэта ўказа — прадаставіць права прыпыняць дзейнасць у сувязі з доглядам дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў і атрымліваць у гэты перыяд дзяржаўную дапамогу ў поўным памеры індывідуальным прадпрымальнікам, прыватным натарыусам, адвакатам, рамеснікам.

Марына Арцёменка растлумачыла, што з 1 студзеня гэтага года гэтым катэгорыям у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2012 года «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў назначаецца і выплачваецца ў памеры 50 працэнтаў ад устаноўленага. Такі падыход ураўноўвае ўсе катэгорыі занятых асоб — і тых, якія працуюць па найме, і тых, якія ажыццяўляюць іншыя віды дзейнасці. Так, жанчынам, якія працуюць па працоўных дагаворах (кантрактах), у выпадку выхаду маці на работу на ўмовах занятасці больш як палавіны месячнай нормы рабочага часу выплата дапамогі ажыццяўляецца ў памеры 50 працэнтаў. Адпаведна асобам, якія ажыццяўляюць іншыя віды дзейнасці (індывідуальным прадпрымальнікам, прыватным натарыусам, адвакатам, рамеснікам), дапамога ў адпаведнасці з законам таксама назначаецца і выплачваецца ў памеры 50 працэнтаў.

«Паколькі сутнасць дапамогі заключаецца ў кампенсаванні страчанага ў гэты перыяд заробку (даходу), то змяншэнне яго памеру тым, хто нараўне з доглядам дзіцяці займаецца пэўнымі відамі дзейнасці, абгрунтавана, — лічыць прадстаўнік міністэрства. — Паводле даных Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва, у мінулым годзе з 3 тыс. 202 індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць догляд дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, па 2 тыс. 225 ІП прадстаўлены даныя падатковых органаў, што пацвярджае факт ажыццяўлення імі дзейнасці. Гэтыя лічбы паказваюць, што ў перыяд догляду дзіцяці каля 70 працэнтаў прадстаўнікоў гэтых катэгорый прадаўжаюць прафесійную дзейнасць».

Разам з тым яны пры ажыццяўленні догляду дзіцяці могуць у гэты перыяд часова не працаваць і не атрымліваць даход. Аднак заканадаўчыя акты не прадугледжвалі механізмаў прыпынення адпаведнай дзейнасці ў сувязі з доглядам дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў па аналогіі з грамадзянамі, якія працуюць па найме і маюць права афарміць сацыяльны водпуск па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту 3 гады. Гэта дзейнасць, у прыватнасці, прадпрымальніцкая, магла быць толькі поўнасцю спынена.

«Аналіз шматлікіх зваротаў грамадзян, якія ажыццяўляюць індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, прыватную натарыяльную, адвакацкую або рамесную дзейнасць, паказаў, што пытанне прыпынення дзейнасці ў перыяд догляду дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў з'яўляецца актуальным, — сказала Марына Арцёменка. — Улічваючы прынцып сацыяльнай справядлівасці, указам прадастаўлена магчымасць выбару — ажыццяўляць дзейнасць у перыяд догляду малалетняга дзіцяці або прыпыніць яе».

Такім чынам, указ устанаўлівае першапачаткова права на прыпыненне дзейнасці індывідуальных прадпрымальнікаў, адвакатаў, прыватных натарыусаў, рамеснікаў у перыяд догляду дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, а пасля, як вынік, — на атрыманне дапамогі ў гэты перыяд у поўным памеры.

Устаноўлена, што парадак прыпынення дзейнасці ў сувязі з доглядам дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў вызначаецца Саветам Міністраў. Гэта значыць, што будзе прынята пастанова ўрада аб зацвярджэнні палажэння аб парадку прыпынення дзейнасці ў сувязі з доглядам дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў.

Гэты парадак будзе заснаваны на заяўным прынцыпе: грамадзянін у пісьмовай форме заяўляе аб сваім жаданні прыпыніць дзейнасць ва ўпаўнаважаны орган, які ажыццяўляе кантроль за адпаведным відам дзейнасці. Такімі ўпаўнаважанымі органамі пастановай Савета Міністраў будуць вызначаны для індывідуальных прадпрымальнікаў, рамеснікаў — падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік у якасці плацельшчыка падатку (збору); для прыватных натарыусаў — галоўнае ўпраўленне юстыцыі аблвыканкамаў (Мінгарвыканкама) па месцы рэгістрацыі прыватнага натарыуса; для адвакатаў — тэрытарыяльная калегія адвакатаў, членам якой з'яўляецца адвакат.

Адначасова гэтым катэгорыям будзе прадастаўлена права аднаўлення дзейнасці шляхам падачы ва ўпаўнаважаныя органы адпаведнай заявы, дадала спецыяліст.

Цяпер у рэспубліцы налічваецца больш як 251 тыс. індывідуальных прадпрымальнікаў, з іх 3,2 тыс. маюць ільготу па вызваленні ад выплаты абавязковых страхавых узносаў у перыяд догляду дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў; 1 тыс. 855 адвакатаў, з іх 124 чалавекі часова не працуюць у сувязі з тым, што маюць дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў; 45 прыватных натарыусаў, у іх няма дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў, больш як 6,9 тыс. рамеснікаў.

# ВОЗЕРА РЫБАКА ПАВАЖАЕ



Фота БЕЛТА.

*Фермерская гаспадарка «Куцанаў і К» Магілёўскага раёна займаецца прамысловым развядзеннем, гадоўляй і рэалізацыяй рыбы. У шасці азёрах, якія арандуе гаспадарка, гадуюцца карпы, амуры, таўсталобікі, шчупакі і ў невялікіх колькасцях самы.*

ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, прэм'ер-міністр:**

***«Выставы айчынных спажывецкіх тавараў трэба правесці ва ўсіх рэгіёнах краіны — у кожнай вобласці рэспублікі, у райцэнтрах. Ініцыятыва Мінскай вобласці, якая сёння арганізавала такую выставу, заслугоўвае распаўсюджвання па ўсёй краіне. У Беларусі вядзецца мэтанакіраваная работа па пашырэнні сегмента спажывецкіх тавараў як па якасці, так і па наменклатуры. Але, на жаль, некаторыя нашы вытворцы, у тым ліку прыватныя, не вытрымліваюць належнай канкурэнцыі з замежнымі. Гэта дрэнна. Таму неабходна паказаць прыклад, як трэба працаваць у гэтым кірунку, канкурыраваць на рынку».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.10.2013 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 9160,00 ▲ |
| Еўра | 12370,00 ▼ |
| Рас. руб. | 283,00 ▲ |
| Укр. грыўня | 1118,78 ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 15° |
| Віцебск | + 12° |
| Гомель | + 13° |
| Гродна | + 15° |
| Магілёў | + 12° |
| Мінск | + 14° |

■ Надвор'е

## З серады пахаладае

У выхадныя тэмпературны фон чакаецца на 2-3 градусы вышэй за кліматычную норму, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла Парашчук. Уначы плюс 3-9, удзень ад 9 градусаў па паўночным усходзе да 18 цяпла па паўднёвым захадзе краіны. У ноч на нядзелю ў крайніх паўночна-ўсходніх раёнах чакаецца каля нуля. У нізкіх месцах і паблізу вадаёмаў будуць згушчацца туманы, істотных ападкаў не чакаецца.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у пачатку наступнага тыдня ў асобных раёнах магчымыя невялікія кароткачасовыя дажджы, месцамі будуць туманы. Уначы плюс 3-10 градусаў, па паўночным усходзе месцамі на глебе замаразкі ад 0 да мінус 2. Удзень да 9-15 градусаў цяпла. А вось у сераду да нас падыдзе паўночна-заходні халодны франтальны раздзел, які прынясе пахаладанне. Пройдуць кароткачасовыя дажджы.

**Сяргей КУРКАЧ**

# ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ ДЛЯ РАСІЙСКІХ СМІ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка 11 кастрычніка правядзе прэс-канферэнцыю для прадстаўнікоў расійскіх рэгіянальных СМІ. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Прэс-канферэнцыя кіраўніка дзяржавы па традыцыі завяршае прэс-тур расійскіх журналістаў па Беларусі, асноўная частка якога ў гэтым годзе прайшла ў Гродзенскай вобласці.

У прэс-канферэнцыі Прэзідэнта Беларусі прымуць удзел больш за 90 чалавек, якія прадстаўляюць федэральныя сродкі масавай інфармацыі, СМІ суб'ектаў Расіі, саюзныя СМІ і Міждзяржаўную тэлерадыёкампанію «Мір». Сукупны тыраж друкаваных выданняў складае амаль 3,5 млн экзэмпляраў. Патэнцыяльная тэлеаўдыторыя — 130 млн чалавек, радыё — больш за 120 млн. Плануецца, што прамая трансляцыя прэс-канферэнцыі пачнецца ў 11.00 на Першым нацыянальным канале Беларускага радыё. Трансляцыя тэлевізійнай версіі прэс-канферэнцыі — у вячэрнім эфіры тэлеканалаў «Беларусь-1», АНТ і СТБ.



Фота БЕЛТА.

Больш як 80 расійскіх журналістаў бяруць удзел у традыцыйным ужо прэс-туры па Беларусі. Прэс-тур прысвечаны актуальным пытанням супрацоўніцтва Беларусі і Расіі. Журналісты, у прыватнасці, наведалі СТАА «Контэ Спа» ў Гродне.

■ Новая галіна эканомікі

# ВЯЛІКІЯ КРЫЛЫ БЕСПІЛОТНАЙ АВІЯЦЫІ

**Літаральна на гэтым тыдні міліцыя Мінскай вобласці пры дапамозе беспілотніка, які выконваў першыя пробныя заданні, за адны толькі суткі выявіла ў Налібоцкай пушчы пяць месцаў вытворчасці самагону. З вышыні птушынага палёту апарат з дапамогай цеплавізара знайшоў старанна замаскіраваныя «бровары». Праўда, тут якраз той выпадак, калі знайсці прасцей, чым дабрацца, бо самагоншчыкі атабарыліся ў самых гушчарах…**

Нядаўна з'явілася інфармацыя пра тое, што гродзенскія пагранічнікі таксама пры дапамозе беспілотніка затрымалі на беларуска-літоўскай мяжы 9 нелегальных мігрантаў.

## Беспілотнік: што гэта такое?

Беспілотны лятальны апарат — гэта той жа самалёт альбо верталёт, звычайна меншы па памерах, кіраванне якім ажыццяўляецца з зямлі. Ён значна таннейшы і больш эканомны ў эксплуатацыі. Па функцыях жа беспілотнік смела можа канкурыраваць са сваімі «вялікімі братамі»: найперш у маніторынгу тэрыторый і разведцы.

На пачатку 90-х гадоў Савецкі Саюз упэўнена займаў галоўнае месца ў свеце па вытворчасці сродкаў такой авіяцыі — усе вядомыя грамадзянскія і ваенныя канструктарскія бюро лічылі за гонар мець уласнай вытворчасці беспілотнікі. Затым лідарства перайшло да ЗША і Ізраіля. Як вядома, калі краіна з нейкім таварам пакідае сусветны рынак як прадавец, то вяртаецца яна на гэты рынак ужо ў якасці пакупніка… Беларусі пашанцавала, бо цягам літаральна некалькіх апошніх гадоў мы стварылі ўласную абсалютна новую авіябудаўнічую галіну — вытворчасць беспілотных лятальных апаратаў (БПЛА). СТАР. 2

# ЛАГІСТЫЧНЫ «РАЙ» ЗА 145 МІЛЬЁНАЎ

**У пасёлку Прывольны Мінскага раёна на тэрыторыі СЭЗ «Мінск» завершана першая чарга будаўніцтва транспартна-лагістычнага комплексу «Прылессе».**



Фота БЕЛТА.

На ўрачыстай цырымоніі адкрыцця першых аб'ектаў **міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ** адзначыў, што пры будаўніцтве гэтага самага буйнога ў краіне транспартна-лагістычнага комплексу ўжываліся сучасныя і перадавыя тэхналогіі і прыцягваліся высокапрафесійныя міжнародныя спецыялісты. Будуе комплекс вядомая як у Іране, так і ва ўсім свеце кампанія «Кейсан». Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства лічыць, што гэты праект рэалізоўваецца настолькі паспяхова дзякуючы адказнаму стаўленню ўсіх работнікаў кампаніі «Кейсан» і выразнаму ўзаемадзеянню беларускага і іранскага бакоў. СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### УКРАІНА МОЖА АДМОВІЦЦА АД РАСІЙСКАГА ГАЗУ



Украіна можа на некалькі бліжэйшых гадоў цалкам адмовіцца ад закупак газу ў Расіі, калі дзейны кантракт «Нафтагаза» і «Газпрама» не будзе перагледжаны. Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Украіны Мікалай Азараў. Паводле яго слоў, Кіеў гатовы праз суд даказваць абсурднасць дзейнага газавага кантракта, калі «Газпрам» падасць на Украіну ў суд за яго невыкананне. Гэтая заява была зроблена ў той жа дзень, калі з Крамля прагучала пагроза ўвесці візавы рэжым паміж краінамі. У чацвер саветнік прэзідэнта Расіі Сяргей Глазьеў заявіў, што ў сувязі з «інтэграцыйнымі працэсамі» такая верагоднасць не выключана: «Калі Украіна ўвойдзе ў Шэнгенскую зону з большасцю краін ЕС, а ў нас па-ранейшаму будзе адсутнічаць бязвізавы рэжым з ЕС, то еўрапейцы вымусяць Украіну ўвесці візавы рэжым», — адзначыў чыноўнік.

### ПЯЦІРАЗОВАЕ ХАРЧАВАННЕ ДАПАМОЖА СКІНУЦЬ ВАГУ

Супрацоўнікі Універсітэта Усходняй Фінляндыі выявілі карысць для здароўя пяціразовага харчавання. Навукоўцы сцвярджаюць, што спалучэнне сняданку, абеду і вячэры з двума «перакусамі» на працягу дня дапамагаюць скінуць вагу. А вось пропуск аднаго з прыёмаў ежы, у прыватнасці, ранішняга, можа прывесці да адваротнага эфекту. Даследчыкі назіралі за станам 4 тысяч дзяцей з моманту іх нараджэння і да дасягнення 16-гадовага ўзросту. І высветлілі, што тыя з іх, хто прытрымліваўся пяціразовага штодзённага харчавання, мелі паніжаны індэкс масы цела. І нават наяўнасць атлусцення ў бацькоў падвыпрабавальных не ўплывала на вынік. А вось пропуск аднаго са штодзённых прыёмаў ежы прыводзіў да набору вагі. Навукоўцы ўпэўнены, што харчовыя звычкі з'яўляюцца важным фактарам рызыкі развіцця атлусцення, і іх уплыў на вагу шмат у чым пераўзыходзіць іншыя фактары.



ISSN 1990 - 763X

13192

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### РАСІЯ — ЛІДАР ПА МАЁМАСНАЙ НЯРОЎНАСЦІ

Расія знаходзіцца на адным з першых месцаў у свеце па няроўнасці размеркавання маёмасці і даходаў — на сённяшні дзень 110 мільярдэрам належыць 35% усіх нацыянальных багаццяў. У гэтым рэйтынгу Расія саступае толькі некалькім невялікім дзяржавам Карыбскага басейна, сведчаць звесткі, апублікаваныя ў аглядзе швейцарскага банка Credit Suisse. У цэлым па свеце мільярдэры валодаюць 1—2% ад нацыянальнага багацця, і на кожныя 170 мільярдаў долараў багаццяў хатніх гаспадарак прыпадае адзін мільярдэр.



Паводле ацэнкі Credit Suisse, у 2013 годзе ў Расіі налічвалася 1986 чалавек, чыё багацце перавышала 50 мільёнаў долараў, а агульную колькасць доларавых мільянераў у Расіі ацанілі ў 84 тысячы чалавек. Прычым да 2018-га банк прагназуе рост колькасці доларавых мільянераў да 133 тысяч чалавек. Па версіі Forbes, у Расіі ў 2013 годзе налічваецца 110 доларавых мільярдэраў, самымі багатымі з якіх прызнаныя Алішэр Усманаў з багаццем у 17,6 мільярда долараў, Міхаіл Фрыдман (16,5 мільярда), Леанід Міхельсон (15,4 мільярда), Віктар Вексельберг (15,1 мільярда) і Вагіт Алекпераў (14,8 мільярда).

КОРАТКА

Мінімальная заработная плата за верасень бягучага года індэксуецца на 6,8 працэнта.

Сімвалам дзіцячага «Еўрабачання-2013» стаў Puzzle Man — чалавечак, сабраны з кавалачкаў мазаікі і расфарбаваны ў колеры ўкраінскага сцяга.

Сучасны ўзровень нараджальнасці ў Беларусі супараўнальны з паказчыкамі еўрапейскіх краін.

Рух усіх відаў транспарту і пешаходаў праз пункт пропуску «Прывалка» на беларуска-літоўскай мяжы адновіцца з 8 гадзін раніцы 15 кастрычніка.

У сярэднім беларусы адпачываюць за мяжой каля 5,5 дня, іншаземец знаходзіцца на тэрыторыі нашай краіны 4,5 дня.

З аптымізмам глядзяць на будучыню Еўрасаюза і перспектывы яго развіцця 64% апытаных жыхароў Літвы. Аптымістычнейшым у поглядах на перспектывы ЕС аказаліся толькі жыхары Даніі і Эстоніі. Найбольшы песімізм у дачыненні да будучыні ЕС адчуваюць жыхары Партугаліі, Кіпра і Грэцыі.

■ Учора

# ШАНЦ НА ВЫЙГРЫШ ЁСЦЬ!

*Раяць справа, вучаць злева…*
*Я і сам не прападу:*
*Як кахаць — дык каралеву,*
*Як выпісваць, то «Звязду»!*

**Шчыры дзякуй усім, хто прытрымліваецца гэтага прынцыпу, хто ў чарговы ці першы раз падпісаўся на найстарэйшую беларускамоўную газету, хто даслаў у рэдакцыю картку на розыгрыш прызоў!**




Фота Аляксандра КУЛЕЎСКАГА.

Ён адбыўся ўчора ў сценах рэдакцыі. Адбыўся, як заўсёды, з удзелам супрацоўніцы РУП «Белпошта» Юліі Субат, а таксама падпісчыц Ірыны Дуняк («стаж» сяброўства з газетай — «гадоў 20—25») і Святланы Чарняўскай, якая «Звязду», можна сказаць, атрымала ў спадчыну… Менавіта ім, гасцям *(на здымку)*, і была даверана адказная місія — з усіх дасланых картак выцягнуць **шчаслівыя**.

Дзіўна, але факт: усе яны, як сведчаць вынікі, запоўнены жаночымі рукамі. Мужчын сярод шчаслівчыкаў… няма. Але ж — будзем спадзявацца — няма толькі на гэты раз. Значыць, ім удача можа ўсміхнуцца ў наступным розыгрышы! Ужо ў новым 2014 годзе… Калі яны, вядома ж, не забудуць крылатае *«Раяць справа, вучаць злева…»*, калі афармяць падпіску і не паленуюцца даслаць свае карткі.

А зрэшты, латарэя — яна і ёсць латарэя. І не выйграе ў ёй той, хто не гуляе. У астатніх шанц заўсёды ёсць!

**АФІЦЫЙНА**

Учора, 10 кастрычніка 2013 года, адбыўся розыгрыш прызавога фонду рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду», арганізатарам якой з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. СТАР. 2

■ Медыяперсона

Юрый ЦАРОЎ:

# «ЖАРТУЮ, АЛЕ НА ЖЫЦЦЁ ПРАЗ ПРЫЗМУ ГУМАРУ НЕ ГЛЯДЖУ»



**Лепшая кампанія — гэта тая, дзе цябе не толькі разумеюць, а дзе яшчэ і весела. Калі такі варыянт вам па душы, то абавязкова трэба пачынаць свой дзень з праграмай «Утроголики 2:0» на радыё «Мір». Тут ужо не першы год працуе Юрый Цароў. Сам вядучы не баіцца называць сябе «ўніверсальным дыджэем». І з такой заявай нельга не пагадзіцца, бо ён, акрамя працы на радыё, паспяхова рэалізоўвае сябе на тэлебачанні, ведае некалькі замежных моў, займаецца каратэ і, да таго ж, з'яўляецца бацькам дваіх дзяцей. На жыццё імкнецца глядзець пазітыўна, умее жартаваць з сябе і шчаслівы, што знайшоў справу свайго жыцця.**

***— У шоу «Утроголики 2:0» вы працуеце цяпер з Канстанцінам Юманавым. З чым звязаны гэтыя перамены?***

— Калі раней у нас быў фармат ранішняга шоу — інфартэймэнт, дзе гучала пераважна інфармацыя забаўляльнага характару, дык потым мы перайшлі на чысты інтэртэймэнт, пакінуўшы ўсю інфармацыю службе навін. Вырашылі дабавіць больш жартаў і пакласці ў аснову дыялог двух мужчын, якім «за», у якіх за плячыма ўжо ёсць пэўны вопыт, і яны дзеляцца ім, з іроніяй абмяркоўваючы агульныя тэмы.

***— У тандэме з мужчынам працаваць лягчэй?***

— Ёсць рэчы, якія з-за выхавання ці нейкіх прынцыпаў з дзяўчынай у эфіры абмяркоўваць немагчыма. Няхай нават яна «свая». Да таго ж ёсць пэўная розніца ў падыходах мужчыны і жанчыны да нейкіх пытанняў, з-за чаго часам узнікае канфлікт меркаванняў. Існуюць шоу, пабудаваныя выключна на такім падыходзе, але з часам гэта перарастае ў аднастайнасць. А нам хацелася пазбегнуць такога развіцця. Калі працуеш з хлопцам, то канфлікт у іншым: у гумары, досведзе, пунктах гледжання, — але двух мужчын.

***— Як вы шукаеце «кропкі судакранання» з аўдыторыяй, каб яна не стамілася ад вашай кампаніі?***

— Па-рознаму. Акрамя працы на радыё, мы — шоумены і можам назіраць рэакцыю людзей на гумар ужывую. Ёсць сацыяльныя сеткі, дзе я, напрыклад, публікую свае жарты і бачу, які водгук знаходзяць мае напрацоўкі ў аўдыторыі. Самае ж галоўнае — даць слухачу магчымасць паверыць у тое, што з табой можа быць цікава! Каб чалавек ведаў: тут вясёлыя вядучыя! Зразумела, жартаваць безупынна нельга. Мы жывыя людзі, і ў кожнага здараюцца свае непрыемнасці, бывае дрэнны настрой. Але эфір дазваляе на тры гадзіны адкласці ўсе думкі і дзяліцца сваім гумарам, іранічным поглядам на жыццё. І калі адчуваеш, што жарт прыняты на «ўра», то атрымліваеш неверагодны зарад станоўчых эмоцый.

> **Самае ж галоўнае — даць слухачу магчымасць паверыць у тое, што з табой можа быць цікава! Каб чалавек ведаў: тут вясёлыя вядучыя!**

***— Што дапамагае вам «падтрымліваць форму»?***

— Як я ўжо казаў, напісанне жартаў і выкладванне іх у сеціве дае разуменне таго, як матэрыял успрымаецца аўдыторыяй. Я таксама імкнуся чытаць усё, што пішуць іншыя. А паколькі я не маю праблем з мовамі, то чытаю нямецкі, англійскі гумар. Насамрэч тэмы анекдотаў ва ўсіх аднолькавыя. Людзі ў глабальнай інфармацыйнай прасторы смяюцца з адных і тых жа рэчаў, проста на розных мовах. У мяне шмат падпісак на розныя рассылкі па тэме гумару. Расказваю жарты сваім знаёмым, спрабую запісваць сябе на камеру, каб адсочваць чысціню мовы, міміку. Ведаеце, у амерыканскіх гумарыстаў існуе «правіла дзесяці», паводле якога ў дзень трэба пісаць дзесяць жартаў. Але ў той жа час не варта забываць пра «правіла дзевяці», згодна з якім дзевяць з іх будуць нічога не вартымі. Часам даводзіцца і прымушаць сябе працаваць праз сілу, але такі падыход акупаецца, як спартыўная трэніроўка.

***— А ўменне жартаваць дапамагае вам у паўсядзённым жыцці?***

— Ніколі над гэтым не задумваўся. Я проста камфортна адчуваю сябе ў любой кампаніі, бо заўсёды магу нешта ўспомніць, з нечага пажартаваць. Магу пажартаваць з самога сябе, але не скажу, што на ўсё ў жыцці гляджу праз прызму гумару. Проста магу «мінус» выправіць на «плюс». Праца дапамагае абстрагавацца. І я з гонарам заўсёды кажу пра тое, што знайшоў справу свайго жыцця.

***— Раскажыце, як гэта адбылося?***

— На радыё прыйшоў выпадкова, па аб'яве, пятнаццаць гадоў таму. Я прафесійны перакладчык, і мне падабалася мая праца. Ніколі не думаў, што акажуся ў «абойме» радыйшчыкаў. А тады проста ехаў з сябрам у машыне і пачуў аб'яву, а хвілін праз дваццаць сустрэў на скрыжаванні былую аднакурсніцу з эканамічнага, якая якраз працавала на той радыёстанцыі ў рэкламным аддзеле. Яна параіла прыйсці і паспрабаваць. Прыйшоў і застаўся: па тэмбры падышоў, дэфектаў з мовай не было, адзінае — нямецкі акцэнт прысутнічаў, але ён стаў маёй «фішкай»... Так усё і закруцілася.

***— У каго вы вучыліся прафесіі і знаходзілі падтрымку?***

— Для мяне ўсе, хто працаваў у fm-прасторы апошнія пятнаццаць гадоў, — аўтарытэты. З многімі была магчымасць папрацаваць разам. Заўсёды прыслухоўваюся да іх парад і меркаванняў, асабліва тады, калі яны выказваюцца ў калідоры з «палопваннем па плячы». Калі яшчэ быў школьнікам, а потым студэнтам, то слухаў передачы Севы Наўгародцава, таму ён для мяне як «радыёікона». Сярод такіх і Уладзімір Туз, з якім, на жаль, не давялося нідзе сустрэцца, а я пра гэта марыў. Ёсць людзі ў нашай сферы, якімі я захапляюся. Раман Трахтэнберг мне вельмі імпанаваў як шоумен. Міша Козыраў — прыклад таго, як крэатыў можа ўплываць на поспех, у тым ліку і камерцыйны. Калі гаварыць пра замежных радыёвядучых, то Говард Стэрн — супер у сваёй эпатажнасці. Капіраваць яго ў нашых умовах абсалютна немагчыма, бо свае эфіры ён будуе на адкрытасці, але не ўсе слухачы падрыхтаваны да такой тактыкі. І ў нас абсалютна іншае развіццё культуры, культуры паводзін.

***— Сумяшчаючы працу на радыё і на тэлебачанні, вы раздзяляеце гэтыя сферы для сябе?***

— Я ніколі не працую на «пустату». І на радыё, і на тэлебачанні ў мяне заўсёды ёсць партнёр, з якім я з задавальненнем будую дыялог. Аднак пэўная спецыфіка існуе. На радыё трэба ўмець данесці да чалавека значэнне сваёй мімікі, жэстаў — і гэта прытым, што ты толькі размаўляеш. А на тэлебачанні з улікам таго, што ёсць абмежаванасць «карцінкі», трэба сачыць за кожным рухам, «працаваць знешнасцю». Бо лішні паварот галавы ці рук — гэта асобная мізансцэна, і мноства рухаў выклікаюць у гледача незадаволенасць.

***— А як вы адчуваеце сябе ў ролі мужа і бацькі?***

— Я ўдзячны сваёй жонцы за тое, што маю магчымасць рэалізоўвацца на працы. І паколькі чалавек творчы — эмацыйны, з абвостранай нервовай сістэмай, то вельмі важна, каб былі ўмовы для адпачынку, магчымасць выгаварыцца. І ў гэтым кантэксце ў мяне ідэальная жонка. Усё, чаго я дабіўся, таксама і яе заслуга. Калі я пачынаў працаваць на радыё, то вольнага часу не заставалася, але мы былі ўвесь час разам. Я люблю праводзіць час з дзецьмі, трэніраваць іх, рабіць з імі хатнія заданні. У стасунках з дзецьмі мне вельмі падабаецца раскладваць усё па палічках, шукаючы да іх падыход.

***— Чаму яны вучаць вас?***

— Дарослыя, як правіла, людзі вельмі закамплексаваныя. Жыццё прымушае нас існаваць у пэўных рамках — адпаведных той ці іншай сітуацыі. А дзеці заўсёды поўныя свабоды і разняволенасці. І гэтай натуральнасці паводзін, зразумела, у рамках дазволенага, варта павучыцца. Бо людзі прыдумляюць сабе мноства стандартаў, якія ўсё роўна потым парушаюць, а галоўнае ж — проста быць такімі, якія мы ёсць. Жыццё даецца адзін раз і перапісваць яго наноў не будзе магчымасці.

**Алена ДРАПКО**

# «МАІХ ПАЧУЦЦЯЎ СЛОВАМІ НЕ ПЕРАДАЦЬ...»

**Разам з Ільёй Волкавым, які сёлета будзе прадстаўляць Беларусь на дзіцячым конкурсе «Еўрабачанне-2013», у Кіеў паедзе інтэрнацыянальны танцавальны гурт. Пра гэта паведаміла падчас прэс-канферэнцыі кіраўнік працоўнай групы дзіцячага конкурсу «Еўрабачанне-2013» Людміла Барадзіна. Таксама яна адзначыла той факт, што прымаючы бок плануе выбіраць і ўзнагароджваць на гэты раз не аднаго, а адразу трох пераможцаў.**



Фота БЕЛТА.

Сярод дзяўчат, якія задзейнічаны ў нумары Ілы, — грузінка, азербайджанка, полька, латышка і дзяўчынка з Расіі. Усе яны займаюцца ў вакальна-інструментальнай студыі «Максі брыз», што дзейнічае на базе 202-й школы Мінска. Па словах Людмілы Барадзіной, у нумары нашага ўдзельніка нічога кардынальна мяняць не плануецца. Будуць хіба што невялікія карэкціроўкі ў касцюмах і ў паводзінах саліста на сцэне, а яшчэ запішуць новую аранжыроўку. У склад беларускай дэлегацыі, якая адправіцца з Ільёй у Кіеў, — творчая група Белтэлерадыёкампаніі, маці хлопчыка, харэограф і педагог па вакале.

Ілья Волкаў ужо другі раз выступіць на сцэне міжнароднага конкурсу, але хлопец зазначае: «Для мяне вялікае шчасце, што я буду прадстаўляць сваю краіну на «Еўрабачанні». Гэта вельмі пачэсна. Маіх пачуццяў не перадаць словамі».

Акрамя музыкі, Ілья займаецца прафесійна спартыўна-бальнымі танцамі. І тут на яго рахунку не адна заслужаная перамога. Калі раней хлопчык марыў быць знакамітым дырыжорам, то сёння мара — стаць вялікім вакалістам і танцорам.

Летась ён займаўся плаваннем, але з-за недахопу часу з заняткамі прыйшлося развітацца. Сумяшчаючы заняткі танцамі і вакалам, юны талент знаходзіць час, каб пагуляць з сябрамі ў футбол, паглядзець фільмы пра фантастычныя падарожжы, а таксама пачытаць пра касмічныя прасторы.

**Алена ДРАПКО.**

■ Сеціва

## СТАРОНКА ІМЯ ГЮНЕШ

**На гэтым тыдні адна з самых яркіх артыстак беларускай эстрады адкрыла свой афіцыйны інтэрнэт-сайт па адрасе www.gunesh.tv. На старонцы — поўны набор: біяграфія і дыскаграфія, фотаздымкі і відэазапісы, навіны і расклад найбліжэйшых выступленняў, кантакты і канцэртны райдар спявачкі, а таксама спасылкі на ўсе афіцыйныя групы Гюнеш у сацыяльных сетках. Ну і, зразумела, гасцявая «кніга водгукаў», якую адданыя прыхільнікі ўжо запоўнілі першымі падзякамі.**

«Адмыслова для прыхільнікаў, якія часта звярталіся да нас з пытаннем, дзе можна знайсці тую ці іншую кампазіцыю, якая не ўвайшла ў альбомы альбо гучала толькі на канцэртах, мы стварылі раздзелы «Нявыдадзенае» і «Экстра», — расказала «Звяздзе» прэс-сакратарка спявачкі. — Там, напрыклад, змешчаны кавер-версіі сусветных хітоў, дуэты з іншымі выканаўцамі, песні на азербайджанскай, беларускай і рускай мовах. Усе іх свабодна можна спампаваць».

Сама ж старонка даступная на дзвюх мовах — рускай і англійскай. «Хацелася, каб інфармацыя была максімальна даступнай як для рускамоўнай публікі, так і для замежнікаў, — тлумачыць гэты выбар артыстка. — А ў будучыні, вельмі магчыма, у меню сайта з'явяцца беларуская і турэцкая мова».




## ТЭЛЕВІЗАР У ІНТЭРНЭЦЕ




**Тэлеканал АНТ запусціў адмысловую версію «ONT.BY» для інтэрнэт-карыстальнікаў. Як абяцае прэс-служба канала, у віртуальнай версіі гледачам прапануюць не толькі аператыўныя навіны і сённяшнія найбольш рэйтынгавыя праекты, але таксама дакументальныя, музычныя, інфармацыйныя і забаўляльныя праграмы, створаныя на АНТ за ўсе 11 гадоў яго існавання.**

У прыватнасці, з самай першай серыі ўжо даступны «Адваротны адлік», праекты «Подых планеты», «Дакументальны дэтэктыў», «Музычныя вечары ў Мірскім замку», «Эстрадны кактэйль», «Гонар нацыі», «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі» ды іншыя. Ёсць і эксклюзіў ад творчай групы, як інтэрнэт-праект «Кругасветка» з Алегам Раманавым», на бліжэйшую будучыню запланаваны яшчэ некалькі праграм, створаных знарок для інтэрнэт-гледачоў. І ўсё гэта — кругласутачна, 7 дзён на тыдзень. «А на Online.ont.by можна не толькі новы інтэрнэт-канал пагля-дзець, але і свежую тэлепраграму «пагартаць», і пакінуць свае прапановы, — дадае прэс-сакратарка АНТ Юлія Дубоўская. — Прычым уплываць на сетку вяшчання можа кожны карыстальнік — праз галасаванне на сайце».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

■ Медыяпрастора

## «НАША СТАЛІЦА»

| | | | |
|---|---|---|---|
| Брэст | 106.6 FM | Бабруйск | 103.6 FM |
| Віцебск | 101.8 FM | Баранавічы | 98.4 FM |
| Мінск | 107.1 FM | Салігорск | 104.3 FM |
| Гродна | 104.2 FM | Пінск | 103.2 FM |
| Магілёў | 107.8 FM | | |

Гарадоў у кожнай краіне можа быць шмат, але сталіца — адна. Кожную нядзелю ў эфіры радыё «Мір» вядучая Кацярына Карпека распавядае пра Мінск і мінчан. Вы можаце пачуць падборку самых цікавых і значных сталічных навін: ад эканамічнага жыцця да культурных і разнастайных кур'ёзных падзей. Вы атрымаеце адказы на пытанні, якія хвалююць кожнага: што будзе з ацяпленнем, ці падаражэе зноў праезд і калі варта правесці прафілактыку прастуд?

Таксама традыцыйна — прагнозы і папярэджанні сіноптыкаў на наступны тыдзень. Праграма прыцягне не толькі мінчан, але і гасцей сталіцы — усіх, хто хоча больш даведацца пра жыццё нашага прыгожага горада.

Па нядзелях у 11.30 слухайце праграму «Наша сталіца» на хвалях радыё «Мір»!

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 14 КАСТРЫЧНІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.35** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.15** Зона Х.
**8.45** Слова Мітрапаліта Філарэта на Пакровы Прасвятой Багародзіцы.
**9.10** У цэнтры ўвагі.
**10.05 Камедыя «Формула кахання».**
**12.10** Дзень у вялікім горадзе.
**13.20** Клуб рэдактараў.
**14.10** Вакол планеты.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Журналісцкае расследаванне.
**15.55** Заўтра — гэта мы!
**16.25** Усё як трэба!
**16.50 Меладрама «Я думаў, ты будзеш заўсёды...».**
**19.20** Арэна.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «Каўчэг».**
**23.50** Дзень спорту.
**0.05 Камедыя «Пра што маўчаць дзяўчаты».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Блізняты».**
**10.15** Навіны надвор'я.
**10.50, 0.05 Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».**
**12.00** Пад грыфам «Вядомыя».
**13.00 Меладрама «Касякі».**
**14.45 Трылер «Масакра».**
**16.45** Беларуская часінка.
**18.55** Баскетбол. Ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Чырвоны Кастрычнік».
**21.25** КЕНО.
**21.30 Серыял «Інтэрны».**
**23.05 Серыял «Рэальныя хлопцы».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.30** «Дабраранак».
**8.00, 18.45, 0.20** «Калейдаскоп».
**8.05, 14.15, 18.40** «Размовы пра духоўнае».
**8.15** «Цені і постаці». Адам Бабарэка.
**8.45** «Музеум».
**9.05** «Спачатку было слова». Навукова-папулярны фільм.
**9.35, 22.40 Серыял «Герой нашага часу».**
**10.20, 22.15** «Дыя@блог». Пра мову.
**10.50** «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана: «Дваццатае стагоддзе пачынаецца». 1-я і 2-я серыі.
**13.20, 23.55** «Святло далёкай зоркі». Памяці Уладзіміра Кузменкі.
**13.50, 23.25** «Пра кінарэжысёра». Фільм-партрэт Аляксандра Карпава-старэйшага.
**14.20** «Вобраз героя. Тадэвуш Касцюшка». Дак. фільм.
**14.50** «Балада пра Свіцязь». Дак. фільм.
**15.15 «Сад». Маст. фільм.**
**16.40** «Наперад у мінулае».
**17.05** «Росчырк часу».
**17.20 «Збянтэжаны Саўка». Кароткаметражны фільм.**
**18.00** «Лабірынты».
**18.25** «Маем рэчы». Бортніцтва.
**18.55 «Чалавек-амфібія». Маст. фільм.**
**20.30** Калыханка.
**20.45 «Аперацыя «Хальцаўге». Маст. фільм.**

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здорава!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Серыял «Закрытая школа».**
**12.10** «Самы лепшы муж».
**13.10** «Добрага здаровейка!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00 Серыял «Ясмін».**
**16.15 Серыял «Хатняя работніца».**
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік». «Класік з Віцебска. Жыццё і смерць Юдэля Пэна».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** Ток-шоу «Пазіцыя».
**22.05 Маст. фільм «Уладар мораў: На краі Зямлі».**
**0.35** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.40** «Вялікае снеданне».
**10.20, 13.00, 20.15** «Гарады, якія спяваюць».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Такі лёс».
**12.30** «Джэймі: абед за 30 хвілін».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** «Зорны рынг». Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў».
**15.30** «Чыстая праца».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Па законе».
**18.30** «Сакрэты старажытных прыгажунь».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.25 Маст. фільм «Мішэль Вальян: прага хуткасці».**
**23.00** «Ваенная тайна».
**0.50** «Эліксір маладосці».

### МІР

**5.00 Серыял «Пяць хвілін да метро».**
**6.35** М/ф.
**7.05** «Цік-так».
**7.20 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**9.15 Маст. фільм «Позняя ягада».**
**10.50** «Разам».
**11.45** «Агульны рынак».
**12.25, 2.35 Серыял «Клон».**
**14.10** Дак. фільм «У свеце каменных джунгляў».
**15.25, 22.10** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.20 Серыял «Чорны крумкач».**
**18.25** «Беларусь сёння».
**19.00 Серыял «Чырвоная капэла».**
**21.25** «Акцэнты».
**21.40, 4.15** «Рэальны свет».
**23.00 Серыял «Чыста англійскія забойствы».**
**0.40 Маст. фільм «Кактэбель».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ранішняя@пошта».
**12.00** «Прамы эфір».
**13.00** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.45** Навіны — Беларусь.
**14.30** Ток-шоу «1000 дробязяў».
**15.10** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.55, 17.10 Серыял «Скліфасоўскі».**
**18.05 Серыял «Ефрасіння. Таежнае каханне».**
**18.55 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».**
**20.40 Серыял «Сваты-6».**
**22.45 Серыял «Права на праўду».**
**23.55** «Шыфры вашага цела. Скура».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55, 13.25** «Суд прысяжных».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.15** «Справа густу».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.35 Серыял «Пчаляр».**
**21.20 Серыял «Карпаў. Сезон другі».**
**23.05** Сёння. Вынікі.
**23.30 Серыял «ППС».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.40, 19.15, 21.05, 23.45** «Надвор'е».
**7.05** «На рыбалку».
**7.20** М/с.
**7.30, 14.25 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».**
**9.10, 17.45 Серыял «Рэванш».**
**10.40 «Сінематограф». Камедыя «У джазе толькі дзяўчаты».**
**12.45 Камедыя «Экзамен».**
**16.10** Мультпарад «Легенда пра Тарзана».
**16.30** «Мой любімы гадаванец».
**17.00 Серыял «Тайныя сувязі».**
**19.20 Серыял «Двайнік».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Драма «Востраў праклятых».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00, 14.00, 18.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30, 17.30** «С.У.П.».
**9.00** «Жонкі алігархаў».
**10.00** «Шлюб без ахвяр».
**11.00, 22.20 Серыял «Маргоша».**
**12.00, 13.30, 17.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**13.00, 16.30** Скетч-шоу «Анекдоты».
**14.30, 23.30** «Улётнае відэа».
**15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**16.00, 18.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**19.00 Серыял «Васьмідзясятыя».**
**20.00 Серыял «Кухня-2».**
**21.10 Серыял «Загс».**
**0.00** «Дарожныя войны».
**0.30** «Ч.П?».

### ІНТЭР+

**7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00** Навіны.
**7.10, 7.35, 8.10, 8.35** Раніца з ІНТЭРам.
**9.10, 22.45** Легенды крымінальнага вышуку.
**9.50, 16.15, 0.50** Судовыя справы.
**10.30, 16.55, 1.30** Сямейны суд.
**11.15, 18.30 Серыял «Маршрут міласэрнасці».**
**12.20** Формула кахання.
**13.05, 23.15 Серыял «Суседзі».**
**13.30, 0.05** Тэлефон даверу.
**14.20 Серыял «Жыццё як жыццё».**
**15.00, 23.45, 6.35** Дак. серыял «Партрэты дзікай прыроды». 1-я серыя.
**15.20** Арол і рэшка.
**17.40, 4.15** Давай пажэнімся!
**19.15, 2.15** Ток-шоу «Датычыцца кожнага».
**20.00, 3.00** Падрабязнасці.
**20.30, 5.05** Давай пажэнімся ва Украіне.
**21.15, 3.30 Серыял «Аднойчы будзе каханне».**
**22.00, 5.50 Серыял «Ясмін».**

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Быў час». 2008 год.
**6.00** «Вернісаж Ільі Рэзніка».1988 год.
**7.15** «КВЗ-87». 1987 год.
**9.00** «Гульцы». Тэлеспектакль. 1978 год.
**11.00** «Ленан з намі». 1990 год.
**12.00, 3.00** «Колба часу».
**13.00** «Вечар у Дзяржаўным Акадэмічным тэатры імя Вахтангава». 1991 год.
**14.05** «Асобы падыход». Фільм-канцэрт. 1959 год.
**15.10** «Праграма «А». 1990 год.
**17.00** «Зорная гадзіна». 1996 год.
**17.40** «Будзільнік». 1983 год.
**18.10** «Часу разбег». Дак. фільм.
**18.30 «Трэст, які лопнуў». 1-я серыя. Маст. фільм.**
**19.40** «Адлюстраванне». Фільм-канцэрт. 1988 год.
**20.00, 2.00** «Час».
**21.00** «Народжаны ў СССР».
**22.00** «Кракадзілу» — 70 гадоў». 1992 год.
**23.05** «Вера, надзея, каханне і... нянавісць». Дак. фільм.
**23.45** «І жартам, і ўсур'ёз». 1988 год.
**0.30 «Пасылка для Святланы». Маст. фільм.**
**1.45** «Вальс аб вальсе». Фільм-канцэрт. 1984 год.
**4.00** «Кінапанарама». Фрагменты выпускаў 1984 года.

### EUROSPORT

**9.30** Матаспартыўны ўік-энд.
**9.45, 18.00, 23.30** Веласпорт.
**11.45** Тэніс. Матс-пойнт.
**12.15** Тэніс. WTA. Фінал.
**14.00, 19.00** Тэніс. WTA.
**21.45** Вось гэта дзіва!!!
**22.00** Пра рэслінг.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 8.00, 12.55, 16.00, 21.00, 2.20** Серыял «Няўдачнік».
**6.15** Камедыя «Усе выраслі».
**9.00** Камедыя «На будоўлю, месье Танер!».
**10.40, 13.55, 1.45** «Камедыянты. Лепшае».
**11.15** Камедыя «Паліцэйскі і малы».
**14.10** Камедыя «У нагу!».
**17.20** Камедыя «Дзякуй, што патурбавалі».
**19.20** Камедыя «Хросныя бацькі».
**22.10** Камедыя «Учора, сёння, заўтра».
**0.10** Камедыя «Проста сябры».
**3.25** Камедыя «Дарога ў Марока».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**2.00, 8.00, 14.00** Камедыя «Я купіў тату».
**3.20, 9.20, 15.20** М/с «Прыгоды пінгвіняняці Лало». М/ф «Холадна! Холадна! Холадна!».
**4.00, 10.00, 16.00** М/с «Магія». Казкі народаў свету. «Хто самы дужы?». М/ф «Легенда аб Сальеры».
**5.00, 11.00, 17.00** Прыгоды «Пасейдон» спяшаецца на дапамогу». Зборнік м/ф «Слон і Моська». «Жыццё і пакуты Івана Сямёнава».
**6.30, 12.30, 18.30** М/с «Нябесныя танцоры».
**7.00, 13.00, 19.00** «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф «Аднойчы раніцай». «Каралева зубная шчотка».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.00, 18.30, 3.30** Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
**10.50, 17.00** Дак. серыял «Паралельны свет».
**11.50, 16.00** Дак. серыял «Варажбітка».
**12.50, 18.00** Дак. серыял «Паляўнічыя на прывідаў».
**13.50** М/ф «Балто 2».
**15.05, 1.00, 5.15** Серыял «Менталіст».
**20.40** Серыял «Жыццё і лёс».
**22.15** Серыял «Паляўнічыя на брыльянты».
**23.15** Маст. фільм «Вялікае алібі».
**1.45** Серыял «Звышнатуральнае».
**2.30** Серыял «Сапраўдная кроў».

### ТБ1000

**5.00, 10.45** Драма «Усмешка Моны Лізы».
**7.10** Камедыя «Пастка для нявесты».
**9.00** Баявік «Пад Адхон».
**13.00** Меладрама «Брудныя танцы 2».
**15.00** Камедыя «Кабельшчык».
**17.00** Трылер «Ідэальны незнаёмец».
**19.00** Драма «Доказ».
**21.00** Камедыя «Ідэальны мужчына».
**23.00** Жахі «Воўк-адзіночка».
**1.00** Трылер «Вядзьмарства».
**3.00** Жахі «Выбар кілера».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Драма «У пачатку слаўных спраў».
**8.40** Драма «Ніцшэ ў Расіі».
**10.20** Меладрама «Нявеста».
**12.00** Камедыя «Лёгкае жыццё».
**13.50** Трылер «Рускі трохвугольнік».
**16.00** Драма «Апошняя рэпрадукцыя».
**20.00** Трылер «Камень».
**22.00** Меладрама «Выкрутасы».
**0.00** Камедыя «Ушчэнт».
**2.00** Драма «Жыві і памятай».
**4.00** Камедыя «Вусатыя нянь».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 21.00, 1.00, 4.00** Ліхтугі за мяжой.
**6.00, 16.00** Сесар Мілан: ваЖак зграі.
**7.00** У пошуках сіняга кіта.
**8.00, 13.00** Каралі рыбалкі.
**10.00** Картачны фокуснік.
**11.00, 23.00** Турэмныя цяжкасці.
**12.00** Шаша праз пекла.
**15.00** Горад акул.
**17.00, 2.00** Апошнія тайны Трэцяга рэйха.
**18.00** Рабі стаўкі і ўзрывай.
**19.00, 0.00, 3.00** Міжнародны аэрапорт Дубай.

### DISCOVERY

**7.00, 16.25** Залатая ліхаманка.
**7.50, 12.20, 21.00, 3.05** Выжыць разам.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35, 10.05** Марпех Дуг.
**10.30, 0.00, 0.30** Што было далей?
**11.25, 3.55** Разбуральнікі легенд.
**13.15, 0.55** Top Gear.
**14.10, 6.05** Махінатары.
**15.05** Пятая перадача.
**15.30, 5.10** Хлопцы з гарматамі.
**17.20, 17.50** Брудныя грошы.
**18.15** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**19.10** Магія Бена Эрла.
**22.00** Беар Грылс: па слядах тых, хто выжыў.
**23.00** Правілы пазадарожнага руху.
**0.00** Самае страшнае.
**1.50** Анамалія цела.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

## АЎТОРАК, 15 КАСТРЫЧНІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.40** Зона Х.
**9.10, 17.35 Серыял «Сэрца Марыі».**
**10.05, 19.55 Серыял «Чкалаў».**
**11.05** «Неверагодныя гісторыі кахання».
**12.10** Дзень у вялікім горадзе.
**13.25, 21.55 Серыял «Каўчэг».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Арэна.
**15.45, 0.45 Серыял «Трыццацігадовыя».**
**16.45** Ток-шоу «Здароўе».
**19.20, 0.25** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**0.15** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Блізняты».**
**10.20** Цела чалавека.
**11.30** Рэпарцёр «Беларускай часінкі».
**12.25, 21.30 Серыял «Інтэрны».**
**14.00, 23.05 Серыял «Рэальныя хлопцы».**
**15.10** Футбол. Таварыскі матч. Беларусь — Японія.
**17.20** Дак. серыял «Азбука добрага самаадчування».
**19.00 Камедыя «Я не я». 1-я і 2-я серыі.**
**21.25** КЕНО.
**0.05 Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.30** «Дабраранак».
**8.00, 18.50, 0.50** «Калейдаскоп».
**8.05** «Тэатр. Выбранае». Драматург Сяргей Кавалёў.
**8.50** «Палескі пачастунак». Ячня.
**9.05, 16.45** «Лабірынты».
**9.35, 22.45 Серыял «Герой нашага часу».**
**10.20, 22.15** «Дыя@блог» . Пра літаратуру.
**10.50 «Чалавек-амфібія». Маст. фільм.**
**12.25, 23.55** «Святло далёкай зоркі». Памяці вядомага паэта Веньяміна Блажэннага.
**12.50, 23.30** «Рэчавы доказ». Чыгунны сведка. Дак. фільм.
**13.15, 0.20** «Праведнікі народаў свету». Фільм першы «Гета».
**13.45** «Карані».
**14.15** «Беларускі космас». Дак. фільм.
**14.45** «Скарбніца Міншчыны». Ракаў.
**15.15 «Аперацыя «Хальцаўге». Маст. фільм.**
**17.10** «Росчырк часу».
**17.25** «Сінематэка». «Песняры» ў кінематографе.
**18.10** «Маем рэчы». Ручнікі.
**18.25** «Камертон». Творчасць Данііла Крамера.
**19.00 «Сямёра адважных». Маст. фільм. 1-я і 2-я часткі.**
**20.30** Калыханка.
**20.45 «Заўтра будзе позна». Маст. фільм.**

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Серыял «Закрытая школа».**
**12.10** «Самы лепшы муж».
**13.10** «Добрага здаровейка!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00 Серыял «Ясмін».**
**16.15 Серыял «Хатняя работніца».**
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Наша Белараша».
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Разведчыцы».**
**23.25** «Вячэрні Ургант».
**0.00 Баявік «Праўдзівая хлусня».**
**2.25** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**9.00, 13.50, 20.15** «Гарады, якія спяваюць». Дзённік.
**9.10** «Сакрэты старажытных прыгажунь».
**10.05** «Жыць будзеце».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35 Серыял «Слова жанчыне».**
**12.30** «Джэймі: абед за 30 хвілін».
**13.00** «Цэнтральны рэгіён».
**14.00 Маст. фільм «Маці і дзіця».**
**16.50** «Па законе».
**18.30** «Нам і не снілася»: «Рог дастатку».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.25 Маст. фільм «Фантамас».**
**23.00** «Жывая тэма».
**0.00** «Аўтапанарама».
**0.25** «Тэрыторыя памылак».

### МІР

**5.00 Серыял «Пяць хвілін да метро».**
**6.35** М/ф.
**7.05** «Цік-так».
**7.20 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**9.00, 10.55, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**9.10 Маст. фільм «Час жаданняў».**
**11.00** «Курбан-Байран».
**12.25 Серыял «Клон».**
**14.05** Дак. фільм «У свеце каменных джунгляў».
**15.25, 22.10** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.20 Серыял «Чорны крумкач».**
**18.25** «Саюзнікі».
**19.00 Серыял «Чырвоная капэла».**
**21.25** «Акцэнты».
**21.40** «Рэальны свет».
**23.05 Серыял «Чыста англійскія забойствы».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Асаблівы выпадак».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Прамы эфір».
**12.40 Серыял «Вольф Месінг: Які бачыў скрозь час».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.45** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Італьянскае шчасце».
**15.05** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.50, 17.10 Серыял «Скліфасоўскі».**
**18.05 Серыял «Ефрасіння. Таежнае каханне».**
**18.55 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».**
**20.40 Серыял «Сваты-6».**
**22.45 Серыял «Права на праўду».**
**23.55** «Спецыяльны карэспандэнт».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55, 13.25** «Суд прысяжных».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.15** «Справа густу».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.35 Серыял «Пчаляр».**
**21.20 Серыял «Карпаў. Сезон другі».**
**23.05** Сёння. Вынікі.
**23.30 Серыял «ППС».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.25, 19.15, 21.05, 23.50** «Надвор'е».
**7.05** М/с.
**7.20, 14.30 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».**
**9.05, 17.45 Серыял «Рэванш».**
**10.35** «Кулінарныя парады».
**11.00, 19.20 Серыял «Двайнік».**
**12.30 Трылер «Чырвоныя агні».**
**16.10** Мультпарад «Легенда пра Тарзана».
**16.30** «Золата маўчання».
**16.45** «Кінаблакнот».
**17.00 Серыял «Тайныя сувязі».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Драма «Аперацыя «Валькірыя».**
**23.20** Ток-шоу «Бульбокс».

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00, 14.00, 18.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30, 17.30** «С.У.П.».
**9.00, 20.00 Серыял «Кухня-2».**
**10.00, 19.00 Серыял «Васьмідзясятыя».**
**11.00, 22.20 Серыял «Маргоша».**
**12.00, 21.10 Серыял «Загс».**
**13.00, 16.30** Скетч-шоу «Анекдоты».
**13.30, 17.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**14.30, 23.30** «Улётнае відэа».
**15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**16.00, 18.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.00** «Дарожныя войны».
**0.30** «Ч.П?».

### ІНТЭР+

**7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00** Навіны.
**7.10, 7.35, 8.10, 8.35** Раніца з ІНТЭРам.
**9.30** «Спатканне з густам».
**10.00, 17.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**10.30, 22.30** «Вясёлыя гісторыі з жыцця».
**11.00, 23.00 Серыял «Аднакласнікі».**
**11.30** «Мужчынская праца».
**12.00, 21.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**12.30, 0.30** Скетч-шоу «Анекдоты».
**13.00, 0.00** «Улётнае відэа».
**13.30, 22.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.00 Серыял «Амазонкі».**
**16.00** «Шлюб без ахвяр».
**17.30** «Нерэальная гісторыя».
**18.00** «Уральскія пельмені».
**20.00 Серыял «Супермакс».**
**23.30** «Цэнтральны мікрафон».

### ІНТЭР+

**6.00** Ток-шоу «Шустэр Live».
**9.30** Смартшоу.
**10.00** Дак. серыял «Містычная Украіна». 1-я серыя.
**10.45, 22.00** Летняя кухня.
**11.30, 5.00 Маст. фільм «Бераг яго жыцця».**
**14.40, 22.45 Маст. фільм «Пажывём—пабачым».**
**15.55 Маст. фільм «Першыя на Месяцы».**
**17.05, 0.05** Легенды крымінальнага вышуку.
**17.35, 0.35** Агенты ўплыву.
**18.20, 1.20 Маст. фільм «Пан».**
**20.00, 3.00** Падрабязнасці.
**20.30, 3.30 Маст. фільм «Кароль, дама, валет».**

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00, 5.35** «Чалавек і закон». 1993 год.
**6.10** «Бліц». Канцэрт. 1990 год.
**6.35** «Фільмы Рыгора Чухрая». 1992 год.
**8.00, 14.00, 2.00** «Час».
**9.00, 3.00** «Народжаныя ў СССР».
**10.00, 4.00** «КВЗ 88-89». Гульня з удзелам каманд МДУ—НДУ—ДДУ. Фінал.
**11.00** «Ядзернае стагоддзе. Культура і бомба». Тэлемост «Масква — Бостан». 1989 год.
**12.20** «Гандлёвы рад». 1992 год.
**12.40** «Дванаццатая ноч». 2-я частка. Спектакль тэатра «Современник». 1978 год.
**15.00** «Колба часу».
**16.00** «Кінапанарама». Фрагменты выпускаў 1977 года.
**17.00** «Быў час». 2008 год.
**18.00** «Дапамажы. Зоркі эстрады — дзецям». Канцэрт. 1992 год.
**18.55** «Часопіс «Московский наблюдатель». Сустрэчы на Арбаце». 1992 год.
**20.00** «Аншлаг!». Фільм-канцэрт. 1983 год.
**21.00 «Быў месяц май». Маст. фільм.**
**23.00** «Фабрыка манекенаў». Дак. фільм.
**23.45** «Аўтапартрэт. Лілія Амарфій». Фільм-канцэрт. 1986 год.
**0.30 «Трэст, які лопнуў». 3-я серыя. Маст. фільм.**
**1.35** «Маленькі канцэрт». 1985 год.

### EUROSPORT

**9.30, 13.45, 16.00, 22.30** Футбол. Чэмпіянат свету (U 17). ААЭ. Групавы этап.
**10.30, 2.00** Тэніс. WTA.
**11.45, 21.00** Фігурнае катанне. Гран-пры. ЗША.
**14.45** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.10** Скетчком «Паміж намі».
**5.20, 12.55, 21.00** Камедыя «Уцёкі ў аўтамабілі».
**5.50, 13.25, 21.30** Камедыя «У парку».
**6.05, 13.40, 21.45** Камедыя «Дзіцячыя аўтамабільныя гонкі».
**6.15** Фэнтэзі «Дзяўчынка ў хлопчыку, хлопчык у дзяўчынцы».
**8.00, 16.00, 2.25** Камедыя «Праца».
**8.30, 16.30, 2.55** Камедыя «Жанчына».
**9.00** Камедыя «Скрадзеныя сэрцы».
**10.40, 13.50, 21.55** «Камедыянты. Лепшае».
**11.15** Меладрама «Дзеля кахання да Мэры».
**14.10** Камедыя «Жаніх напракат».
**17.20** Камедыя «Бетховен».
**19.20** Камедыя «Фараоны і Роберсаны».
**22.10** Камедыя «Дзевяць ярдаў 2».
**23.45, 1.00** Камедыя «Каралі і капуста».
**3.20** Прыгоды «Фантамас супраць Скотланд Ярда».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**2.00, 8.00, 14.00** Меладрама «Калі я стану веліканам».
**3.25, 9.25, 15.25** М/с «Баба-Яга супраць!». М/ф «Нямухінскія музыкі».
**4.00, 10.00, 16.00** М/с «Магія». Казкі народаў свету. «Здзяйсненне жаданняў». М/ф «Задам-наперад».
**5.00, 11.00, 17.00** Фільм-казка «Іван ды Мар'я». М/ф «Эх!».
**6.30, 12.30, 18.30** М/с «Нябесныя танцоры».
**7.00, 13.00, 19.00** «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф «Францішак». «Шчаня і старая тапачка».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.15, 4.55** Серыял «Сябры».
**10.45** Маст. фільм «Гамбіт».
**12.30, 2.50** Маст. фільм «Пудзіла».
**14.50, 1.15** Серыял «Вар'яты».
**16.45** М/ф «Балто 3».
**18.05** Маст. фільм «Гэтае выдатнае жыццё».
**20.00** Маст. фільм «Русалка».
**22.00** Маст. фільм «Законапаслухмяны грамадзянін».
**0.00** Серыял «Жарабец».
**0.30** Серыял «Кліч крыві».

### ТБ1000

**5.00** Драма «Закаханыя».
**7.00, 21.10** Камедыя «Каханне, якое збівае з ног».
**9.00** Меладрама «Вечнае ззянне чыстага розуму».
**11.00** Баявік «Уладар пярсцёнкаў: Вяртанне Караля».
**14.30** Меладрама «Змярканне».
**16.50** Фантастыка «Змярканне. Сага. Маладзік».
**19.10** Фэнтэзі «Мой хатні дыназаўр».
**22.55** Трылер «Добры немец».
**0.50** Драма «Перапыненае жыццё».
**3.05** Драма «Скарб».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Драма «Мілы, дарагі, каханы, адзіны...».
**7.30** Драма «У Парыж!».
**9.50** Драма «Верабей».
**11.30** Трагікамедыя «Тэатр».
**14.00** Меладрама «Мамы».
**16.00** Прыгоды «1812: Уланская балада».
**17.50** Драма «Матч».
**20.00** Драма «Высоцкі. Дзякуй, што жывы».
**22.15** Драма «Адміралъ».
**0.20** Меладрама «Іронія лёсу. Працяг».
**2.20** Трагікамедыя «Душка».
**4.10** Камедыя «Стэп бай стэп».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Горад акул.
**6.00, 8.00** Дзікі тунец.
**7.00** Рабі стаўкі і ўзрывай.
**9.00** Каралі рыбалкі.
**10.00, 16.00** Гульня ў лічбы.
**11.00, 13.00, 19.00** Гульні розуму.
**12.00** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**14.00** Вялікія міграцыі.
**15.00** Дзікая прырода Амазонкі.
**17.00** Месца жыхарства — Марс.
**18.00** Гісторыя небаскробаў.
**20.00, 0.00, 3.00** Знаёмцеся: мнагажэнцы.
**21.00, 1.00, 4.00** Забароны ЗША.
**22.00** Панарама 360°.
**23.00, 2.00** Расследаванні авіякатастроф.

### DISCOVERY

**7.00, 17.20** Як гэта ўстроена?
**7.25, 12.45, 13.40** Махінатары.
**8.15, 18.15** Выжыць разам.
**9.10, 19.10, 2.40** Правілы пазадарожнага руху.
**10.05, 22.00** Рачныя монстры.
**11.00, 6.05** Шукальнікі скарбаў Амерыкі.
**11.50, 12.20** Паляўнічыя на рэліквіі.
**14.35** Пятая передача.
**15.30** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**16.25** Магія Бена Эрла.
**17.50, 4.45** Як гэта зроблена?
**20.05** Беар Грылс: па слядах тых, хто выжыў.
**21.00** Смяротны ўлоў.
**23.00, 3.30, 3.55** Шалёная рыбалка.
**0.00** Самыя сакрэтныя збудаванні Амерыкі.
**0.55** Пераломныя бітвы.
**1.50** Мафія амішаў.
**4.20** Маланкавыя катастрофы.
**5.10** Паляўнічыя на склады.

## НЯДЗЕЛЯ, 20 КАСТРЫЧНІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.25 Меладрама «Мітусня».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Арсенал.
**9.35, 0.25 Камедыя «Ластаўчына гняздо».**
**12.10** Зона Х.
**12.45** Каробка передач.
**13.20** Урачэбныя тайны.
**13.55** Заўтра — гэта мы!
**14.25** «Terra incognita. Беларусь невядомая».
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Клуб рэдактараў.
**16.15 Камедыя «Хто падставіў труса Роджэра».**
**17.55** «Мая праўда». «Мікалай Валуеў. Мой ласкавы і пяшчотны звер».
**18.55** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Металург» (Македонія) — «Дынама-Мінск» (Беларусь).
**20.35** БеларусьLIFE.
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Журналісцкае расследаванне.
**22.35 Меладрама «Чалавек, які кахае».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.55** М/ф: «Віні Пух», «Віні Пух і дзень клопатаў», «Віні Пух ідзе ў госці».
**8.35** Фільм-казка «Восеньскі падарунак фей».
**9.50** Пазакласная гадзіна.
**10.10** Тэлебарометр.
**10.15, 22.50** «Жаночая ліга. Бананавы рай».
**10.45 Меладрама «Прадаўшчыца».**
**12.45 Камедыя «Трыццаць тры».**
**14.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**14.55** Баскетбол. Ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Нептунас» (Літва).
**16.55** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Рэспублікі Беларусь. «Гомель» — БАТЭ.
**19.15** Суперлато.
**20.25** Навіны надвор'я.
**21.00** Спортлато 5 з 36.
**21.05** КЕНО.
**21.10 Камедыя «Няўдачлівыя».**
**23.20** Спорт-кадр.

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 0.20** «Калейдаскоп».
**8.05** «Таямніца душы».
**8.35, 12.25, 0.10** «Галасы з мінулага».
**8.45** «Максім Танк». Дак. фільм.
**9.20** «Пінская флатылія». Дак. фільм.
**10.00** «Жалезныя майстры». Дак. фільм.
**10.15** «Радуйся!». Фільм-партрэт кампазітара Віктара Капыцькі.
**10.40** «Карані».
**11.05** «Пявучая бронза Занковіча». Дак. фільм.
**11.35** «Полацк». Дак. фільм.
**11.50** «Пра тое, што помню і люблю». Дак. фільм.
**12.10** «У рэху імені твайго...». Барбара Радзівіл.
**12.45 Серыял «Агнём і мячом». 1-я — 4-я серыі.**
**16.10** «Без права на дубль». Аляксандр Кайданоўскі.
**16.55, 22.05** «Культпрасвет».
**17.25 Дзіцячы фільм. «Мёд асы».**
**18.45** Сусветнае кіно. «Аповесць пра бедных закаханых».
**20.30** Калыханка.
**20.50** VIII Міжнародны фестываль Юрыя Башмета.
**22.35** «Раскіданае гняздо». Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага.

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** Нядзельная пропаведзь (з субцітрамі).
**9.20** М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».
**9.35** «Бесталковыя нататкі».
**9.55** «Пакуль усе дома».
**10.50** «Фазэнда».
**11.25** «Вясельны пярэпалах».
**12.25** «Брэйн-рынг».
**13.25** «Ісціна дзесьці побач».
**13.45 Камедыя «Канікулы строгага рэжыму».**
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Куб».
**17.35** «Эстрадны кактэйль».
**18.50** «Я люблю Беларусь!».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Ледніковы перыяд».
**0.05 Трылер «На мяжы».**

### СТБ

**6.00 Серыял «Next».**
**7.40 Маст. фільм «Бяссонніца».**
**9.50, 16.50, 20.40** «Гарады, якія спяваюць».
**10.00, 17.00** «Аўтапанарама».
**10.30** «Тайны свету».
**11.30** «Вялікае снеданне».
**12.10** «Добры дзень, доктар».
**12.45 Маст. фільм «Вялікая перамена». 2-я серыя.**
**14.10** «Тэрыторыя памылак».
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**16.30** «24 гадзіны».
**17.30** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**19.30** «Тыдзень».
**21.15 Маст. фільм «Герцагіня».**
**23.20 Маст. фільм «Апошні ўрок».**
**0.50** «Якія людзі!».

### МІР

**5.00 Маст. фільм «Казкі старога чараўніка».**
**7.30** М/ф.
**8.05** «Ведаем рускую».
**9.00, 15.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**9.10** «Зямля і неба».
**9.35** «Прыгоды Македонскай».
**9.50** «Нітка да ніткі».
**10.15, 0.25 Маст. фільм «Трое разгневаных мужчын».**
**13.25 Маст. фільм «Новы бай».**
**15.10** Ток-шоу «Яшчэ не разам».
**15.45, 21.00 Серыял «Тайга. Курсы выжывання».**
**20.00** «Разам».
**22.35 Маст. фільм «Слухаючы цішыню».**
**2.35 Маст. фільм «Тры таварышы».**
**3.55** «Народы Расіі».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00 Маст. фільм «Секта».**
**10.10** «Сам сабе рэжысёр».
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.15** «Смехапанарама».
**11.45** «У свеце жывёл».
**12.20 Маст. фільм «Яшчэ кахаю, яшчэ спадзяюся...».**
**14.15** «Мая планета».
**14.35 Маст. фільм «Выпрабаванне вернасцю».**
**18.00** «Смяяцца дазваляецца».
**21.25** «Наш выхад!».
**23.10** «Нядзельны вечар».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.25 Серыял «Дарожны патруль».**
**8.00, 10.00, 13.00** Сёння.
**8.20** «Дзікі свет».
**8.50** «Іх норавы».
**9.25** «Ядзім дома!».
**10.20** «Дачны адказ».
**11.25** «Паедзем, паядзім!».
**11.55** «Цуд тэхнікі».
**12.30** «Першая передача».
**13.15 Маст. фільм «Двое ў чужым доме».**
**15.05 Серыял «Важняк».**
**16.45** «Следства вялі..».
**17.35** «Ворагі народа».
**18.25** Надзвычайнае здарэнне.
**19.00** «Сёння. Падагульняючая праграма».
**19.50 Маст. фільм «Дубля не будзе».**
**21.35** «Новыя рускія сенсацыі».
**22.40** «Ты не паверыш!».
**23.30** «Як на сповездзі».
**0.25** «Луч Света».
**0.55** «Школа зласлоўя».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 12.15, 19.05, 21.00, 23.40** «Надвор'е».
**9.05, 14.30** Мультпарад.
**9.30** «Мой любімы гадаванец».
**10.00** «Адшукваецца адпачынак».
**10.40** «VR дайджэст».
**11.00 «Сінематограф». Меладрама «Апантаная».**
**12.20 Трылер «Спакуса».**
**14.20, 23.20** «Кінаблакнот».
**15.15 Серыял «Камісар Рэкс».**
**17.00** Ток-шоу «Бульбокс».
**17.30 Серыял «У стылі Джэйн».**
**19.10 Трылер «Сярод белага дня».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.10 Трылер «Забыццё».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30 Серыял «Татавы дочкі».**
**9.30, 16.30** Скетч-шоу «Асцярожна, дзеці!».
**10.30** «Вясёлыя гісторыі з жыцця».
**11.00 Серыял «Аднакласнікі».**
**11.30** «З'ешце гэта неадкладна».
**12.00, 23.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**12.30, 0.30** Скетч-шоу «Анекдоты».
**13.00, 0.00** «Улётнае відэа».
**13.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.00** «Жонкі алігархаў».
**15.00 Серыял «Супермакс».**
**17.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**17.30 Серыял «Святлафор».**
**20.00** «Цэнтральны мікрафон».
**20.30** «Нерэальная гісторыя».
**21.00** «Уральскія пельмені».

### ІНТЭР+

**8.15, 23.15 Маст. фільм «Першыя на Месяцы».**
**9.30** Школа доктара Камароўскага.
**10.05, 4.30** Усё для мамы.
**10.40, 3.45** Арол і рэшка. Назад у СССР.
**11.25 Маст. фільм «Пажывём—пабачым».**
**12.40** Формула кахання.
**13.25 Маст. фільм «Пан».**
**15.05 Маст. фільм «Бераг яго жыцця».**
**18.15, 22.45** Легенды крымінальнага вышуку.
**18.45, 20.45, 0.30 Маст. фільм «У бары брусніца».**
**20.00, 3.00** Падрабязнасці тыдня.
**22.05** Дак. серыял «Містычная Украіна». 1-я серыя.
**5.00** Феерыя падарожжаў.
**5.20 Маст. фільм «Кароль, дама, валет».**

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Ядзернае стагоддзе. Культура і бомба». Тэлемост «Масква — Бостан». 1989 год.
**6.20** «Гандлёвы рад». 1992 год.
**6.40** «Дванаццатая ноч». 2-я частка. Спектакль тэатра «Современник». 1978 год.
**8.00, 2.00** «Час».
**9.00** «Колба часу».
**10.00** «Кінапанарама». Фрагменты выпускаў 1977 года.
**11.00** «Быў час». 2008 год.
**12.00** «Дапамажы. Зоркі эстрады — дзецям». Канцэрт. 1992 год.
**12.55** «Часопіс «Московский наблюдатель». Сустрэчы на Арбаце». 1992 год.
**14.00** «Аншлаг!» Фільм-канцэрт. 1983 год.
**15.00 «Быў месяц май». Маст. фільм.**
**17.00** «Сяргей Бандарчук». Апошняе інтэрв'ю. 1994 год.
**18.00, 3.00** «Народжаныя ў СССР».
**19.00** «Во, жыццё давяло!». Шоу-праграма Аляксандра Буйнова. 1994 год.
**20.00** «Што? Дзе? Калі?». 1983 год.
**21.30** «Зорны вечар у Лужніках». Канцэрт. 1992 год.
**23.00, 23.35** «Чалавек і закон». 1993 год.
**0.10** «Бліц». Канцэрт. 1990 год.
**0.35** «Фільмы Рыгора Чухрая». 1992 год.
**4.00** «КВЗ 88-89». Гульня з удзелам каманд МДУ—НДУ—ДДУ. Фінал.

### EUROSPORT

**9.30** Аўтаспартыўны часопіс.
**9.35, 1.00** Аўтаспорт.
**13.00, 16.30** Супербайк. Чэмпіянат свету.
**14.00** Мотаспорт. Суперсток. Чэмпіянат свету.
**15.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
**17.30, 1.30** Футбол. Чэмпіянат свету (U 17). ААЭ. Групавы этап.
**21.00** Тэніс. WTA. Фінал.
**22.00** Фігурнае катанне. Гран-пры. ЗША.
**0.45, 2.15** Мотаспартыўны ўік-энд.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 12.55, 21.00** Камедыя «Праца».
**5.45, 13.25, 21.35** Камедыя «Жанчына».
**6.15** Меладрама «Дзеля кахання да Мэры».
**7.45, 12.40, 13.55, 15.45, 1.45** «Камедыянты. Лепшае».
**8.00, 16.00, 2.25** Камедыя «Уцёкі ў аўтамабілі».
**8.30, 16.30, 2.50** Камедыя «У парку».
**8.50, 16.50, 3.10** Камедыя «Дзіцячыя аўтамабільныя гонкі».
**9.00** Камедыя «Жаніх напракат».
**11.15** Камедыя «Бетховен».
**14.10** Камедыя «Дзевяць ярдаў 2».
**17.20** Камедыя «Фараоны і Роберсаны».
**19.20** Камедыя «Увесь я».
**22.10** Камедыя «Як скрасці мільён».
**0.15** Камедыя «Скрадзеныя сэрцы».
**3.25** Фэнтэзі «Дзяўчынка ў хлопчыку, хлопчык у дзяўчынцы».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**2.00, 8.00, 14.00** Фільм-казка «Снежная каралева».
**3.20, 9.20, 15.20** М/с «Прыгоды коніка Кузі». М/ф «У свеце баек».
**4.00, 10.00, 16.00** М/с «Магія». Казкі народаў свету. «Залатое пёрка». Зборнік м/ф «На лясной сцяжынцы». «Блытаніна».
**5.00, 11.00, 17.00** Казкі рускіх пісьменнікаў. «Прыгоды Бураціна». Казкі Бажова. «Медная гары гаспадыня».
**6.30, 12.30, 18.30** М/с «Нябесныя танцоры».
**7.00, 13.00, 19.00** «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф «Тыграня ў чайніку». «Здаравяк».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.15, 5.10** Серыял «Сябры».
**10.45** Маст. фільм «Патапаў. Да дошкі!».
**12.20, 2.45** Маст. фільм «Тэгеран-43».
**15.15, 1.05** Серыял «Вар'яты».
**17.15** Маст. фільм «Грамабой».
**19.00** Маст. фільм «Бруклінскія паліцэйскія».
**21.45** Маст. фільм «Скайлайн».
**23.40** Серыял «Жарабец».
**0.15** Серыял «Кліч крыві».

### ТБ1000

**5.00, 13.10** Фэнтэзі «Мой хатні дыназаўр».
**7.00** Меладрама «Вечнае ззянне чыстага розуму».
**9.00** Трылер «Добры немец».
**10.55** Драма «Перапыненае жыццё».
**15.25** Фантастыка «Змярканне. Сага. Маладзік».
**17.40** Фэнтэзі «Змярканне. Сага. Зацьменне».
**20.00** Трагікамедыя «Моцная жанчына».
**22.30** Драма «Скарб».
**1.00** Камедыя «Сур'ёзны чалавек».
**3.00** Драма «Забытыя жаданні».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Трагікамедыя «Тэатр».
**8.30** Меладрама «Васількі для Васілісы».
**10.15** Камедыя «Стэп бай стэп».
**12.10** Камедыя «Не хадзіце, дзеўкі, замуж».
**13.40** Камедыя «Канікулы строгага рэжыму».
**15.50** Драма «Адміралъ».
**18.00** Меладрама «Іронія лёсу. Працяг».
**20.00** Прыгоды «1812: Уланская балада».
**21.50** Драма «Матч».
**0.00** Драма «Высоцкі. Дзякуй, што жывы».
**2.20** Камедыя «Ушчэнт».
**4.00** Баявік «Выкрадальнікі кніг».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Вяртанне насарогаў.
**6.00, 8.00** Дзікі тунец.
**7.00** Рабі стаўкі і ўзрывай.
**9.00, 17.00** Каралі рыбалкі.
**10.00, 13.00, 16.00** Гульні розуму.
**12.00** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**14.00** Вялікія міграцыі.
**15.00** Дзікая прырода Амазонкі.
**20.00, 0.00, 3.00** Машыны: разабраць і прадаць.
**22.00** Мегазаводы.
**23.00, 2.00** Расследаванні авіякатастроф.

### DISCOVERY

**7.00, 8.15** Як гэта ўстроена?
**7.25, 3.30** Пэн і Тэлер, праўда і хлусня.
**8.40, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.10** Смяротны ўлоў.
**10.05** Шалёная рыбалка.
**11.00** Беар Грылс: па слядах тых, хто выжыў.
**11.50, 16.25** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**12.45** Разбуральнікі легенд.
**13.40, 0.55** Скрозь кратовую нару.
**14.35, 0.00** Цуды Сонечнай сістэмы.
**15.30, 1.50** Гармонія і хаос.
**20.05** Не спрабуй паўтарыць.
**22.00** Геній распрацовак.
**23.00, 2.40** Невытлумачальнае: спецыяльныя матэрыялы.
**4.20** Маланкавыя катастрофы.
**5.10** Пятая перадача.
**6.05** Махінатары.

Сяргей МАСКЕВІЧ:

# «НАСТАЎНІК — ПРАФЕСІЯ КРУГЛАСУТАЧНАЯ»

**У рэдакцыі «Звязды» прайшла «прамая лінія» з міністрам адукацыі Сяргеем Маскевічам. Адказы на найбольш важныя і цікавыя пытанні мы змяшчаем на старонках газеты.**


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Аляксандр, настаўнік, г. Мінск:

**Я працую настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў мінскай школе. У мяне адзін пяты клас, два сёмыя і два восьмыя. У пятым класе сшыткі трэба правяраць пасля кожнага ўрока. У сёмых класах — раз у тыдзень, і ў восьмых класах — раз у два тыдні. Па літаратуры ва ўсіх класах трэба правяраць сшыткі раз у месяц. Плюс праверка кантрольных работ: дыктоўкі, пераказы, сачыненні... За ўвесь гэты аб'ём работы мне аплачваюцца ўсяго 2 гадзіны ў тыдзень. За класнае кіраўніцтва аплачваюцца 4 гадзіны ў тыдзень, хоць насамрэч адзін толькі паход з дзецьмі ў музей аднімае 4 гадзіны. А ёсць жа яшчэ абавязковая класная гадзіна, гадзіна інфармавання, восенню — прыбіранне тэрыторыі. Даводзіцца займацца арганізацыяй харчавання дзяцей, зборам макулатуры, запаўняць анкеты, праводзіць мерапрыемствы і гэтак далей. Спецыяльна падлічваў: пазакласная работа з дзецьмі — гэта мінімум 8—10 гадзін у тыдзень. А падрыхтоўка да ўрокаў? Канспекты ўрокаў немагчыма выкарыстоўваць дзесяцігоддзямі... Чаму педагогам уся гэтая работа не аплачваецца?**

— Сёння працягласць працоўнага часу педагога складаецца з нармаванай і ненармаванай частак. У нармаваную ўключаецца аб'ём урочнай работы — 20 гадзін на стаўку. Час на падрыхтоўку настаўніка да ўрокаў нарматыўнымі дакументамі не прадугледжаны і не аплачваецца. Але, зразумела, што настаўнікі працуюць не 20 гадзін у тыдзень, а значна больш. Настаўнік — прафесія кругласутачная. Я не падзяляю думку, што задача школьнага настаўніка заключаецца толькі ў аказанні вучням адукацыйных паслуг. І не думаю, што магчыма ўсю работу, якую даводзіцца выконваць настаўнікам, уключыць у рамкі вучэбнай нагрузкі.

Пэўны час таму пры Міністэрстве адукацыі была створана рабочая група па вывучэнні пытанняў пераходу на іншую сістэму аплаты працы. Разглядаліся розныя варыянты, у тым ліку і штатна-акладная сістэма, якая дзейнічае ў многіх краінах свету, у тым ліку ў Расіі. Штатна-акладная сістэма — гэта 36 гадзін на тыдзень, якія нарміруюцца і аплачваюцца.

Але мы запусцілі з 1 верасня ў пяці сталічных установах адукацыі эксперымент па апрабацыі галіновай сістэмы аплаты працы. У рамках эксперыменту ў навучальных установах уводзяцца галіновыя выплаты за шэраг відаў работ: за работу па арганізацыі харчавання і аздараўлення навучэнцаў — да 15% ад акладу (стаўкі); за выкладанне вучэбных прадметаў на павышаным узроўні (да 5%); за работу з адоранымі навучэнцамі, падрыхтоўку да ўдзелу ў алімпіядах, конкурсах, турнірах (да 10%); за ўдзел у эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці (да 10%); за асаблівы характар работы ў класе з інтэграваным навучаннем, за арганізацыю груп падоўжанага дня і г.д. Галіновая сістэма аплаты працы педагагічных работнікаў уключае аклад (стаўку), выплаты, якія ўлічваюць галіновыя асаблівасці работы ў сферы адукацыі, і выплаты стымулюючага характару. Фактычна ў кіраўніка ўстановы ёсць магчымасць рэгуляваць памеры заробкаў педагогаў у залежнасці ад аб'ёмаў нагрузкі і важнасці для навучальнай установы той работы, якая выконваецца педагогам.

Бацькі першакласнікаў:

**— Сяргей Аляксандравіч, у гімназіі № 39 г. Мінска ў першых класах колькасць вучняў дасягае 34 чалавек. Зусім нядаўна на прэс-канферэнцыі вы казалі, што напаўняльнасць першых класаў была павялічана да 24 чалавек. Скажыце, калі ласка, чым у такім выпадку выклікана вялікая колькасць вучняў у першых класах нашай гімназіі? Раён у нас — старой забудовы. А на прылеглай тэрыторыі з новабудоўлямі даўно адкрыты свае школы. Вы ж цудоўна разумееце, што такая вялікая колькасць вучняў у класе негатыўна адаб'ецца на ведах і падрыхтоўцы нашых дзяцей, не кажучы ўжо пра парушэнні ўсіх санітарна-эпідэміялагічных нормаў...**

— Дзяцей у першы клас прымае кіраўнік установы адукацыі па заявах іх бацькоў. Згодны, гэта няправільна, калі дырэктар не нарміруе колькасць навучэнцаў у класах. Мы даручым разабрацца з сітуацыяй і запрасіць у гімназію на работу яшчэ аднаго настаўніка першых класаў.

> «Сёлета заяўка на педагагічных работнікаў для дашкольных устаноў склала ў Мінску 457 чалавек. А працаўладкаваны ў дзіцячыя садкі былі толькі 42 маладыя спецыялісты».

Ларыса Сяргееўна, педагог вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі:

**— Нядаўна з'явілася інфармацыя аб адраджэнні ў сталіцы педагагічнага каледжа. Сяргей Аляксандравіч, а як вы лічыце: якой павінна быць адукацыя ў выхавацеля дзіцячага садка? Наколькі я памятаю, некалькі гадоў таму, наадварот, спрабавалі ўсіх пераканаць, што без вышэйшай адукацыі забяспечыць усебаковае развіццё дзіцяці дашкольнага ўзросту немагчыма, тым больш што ў нашых садках мы не проста даглядаем дзяцей, а даём ім дашкольную адукацыю, рыхтуем да школы. Ці не атрымаецца так, што, калі праблема дэфіцыту педагогаў у сталічнай сістэме адукацыі будзе вырашана, мы зноў адмовімся ад педагагічных каледжаў? І як вы ставіцеся да таго, што ў Мінску ў дзіцячых садках працуюць выхавацелямі людзі без педагагічнай адукацыі?**

— Пасаду выхавацеля дашкольнай установы можа займаць педагог як з вышэйшай, так і з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, які навучаўся па профілях «Педагогіка» (кірунак «Педагогіка дзяцінства»), «Педагогіка. Прафесійная адукацыя», а таксама педагог, які прайшоў перападрыхтоўку па кірунку «Педагогіка дзяцінства» без прад'яўлення патрабаванняў да стажу работы.

Кадравая сітуацыя ў сталічных дзіцячых садках нас і сапраўды вельмі хвалюе. Дэфіцыт кадраў у многім абумоўлены спецыфікай сталічнага рэгіёна, дзе ў выпускнікоў устаноў адукацыі ёсць шмат магчымасцяў працаўладкавацца на іншыя спецыяльнасці з больш высокім заробкам.Таму, адпрацаваўшы па размеркаванні, маладыя спецыялісты, а таксама спецыялісты, якія маюць няпрофільную педагагічную адукацыю (настаўнікі-прадметнікі), шукаюць больш прэстыжную і высокааплатную работу. Так, сёлета заяўка на педагагічных работнікаў для дашкольных устаноў склала па Мінску 457 чалавек. А працаўладкаваныя ў дзіцячыя садкі былі толькі 42 маладыя спецыялісты. Такім чынам, вакантнымі ў сталічных дашкольных установах застаюцца больш як 400 ставак педагагічных работнікаў.

У сітуацыі дэфіцыту кадраў распрацоўваюцца розныя варыянты, у тым ліку і падрыхтоўка спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Мяркуем, што прыцягненне ва ўстановы дашкольнай адукацыі спецыялістаў, якія не маюць дашкольнага профілю, пенсіянераў, студэнтаў пятых курсаў універсітэтаў толькі часова вырашае кадравую праблему і часта негатыўна адбіваецца на якасці адукацыйнага працэсу.

Таму Міністэрства адукацыі пастаянна прымае меры па ўрэгуляванні сітуацыі з забеспячэннем устаноў дашкольнай адукацыі кадрамі. Цяпер педагагічныя кадры рыхтуюць як вышэйшыя, так і сярэднія спецыяльныя ўстановы адукацыі. Прыём у іх павялічваецца ў адпаведнасці з патрэбамі рэгіёнаў і магчымасцямі ўстаноў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Выкладчык вышэйшай навучальнай установы, г. Брэст:

**— У вышэйшых навучальных установах ужо распачалося скарачэнне кадраў. Дэмаграфічная сітуацыя плюс недабор студэнтаў у сувязі з павышэннем мінімальнага бала на ЦТ адыгралі сваю ролю. Некаторыя выкладчыкі ўжо задумаліся, каб пайсці працаваць у школу... Але тут узнікае пытанне: калі выкладчык ВНУ не мае ступені і звання, то яму ў школе трэба распачынаць сваю кар'еру фактычна з нуля. Ён не мае права нават на другую кваліфікацыйную катэгорыю. Калі школам патрэбны настаўнікі прыродазнаўча-навуковых дысцыплін, то, можа быць, варта было б падумаць пра тое, каб спрасціць атрыманне першай і вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі былым выкладчыкам ВНУ і ССНУ?**

— Напэўна, не трэба блытаць выкладчыцкую работу ў ВНУ і работу настаўніка ў школе. Дастаткова прыгадаць першыя нацыянальныя школьныя падручнікі, якія ствараліся выкладчыкамі ВНУ. Якой складанай мовай яны былі напісаны! Лічу, што для таго, каб працаваць у школе, недастаткова ведаць дасканала свой прадмет. Таксама трэба ведаць — абавязкова — і дзіцячую псіхалогію, а навучальныя тэхналогіі, прыёмы і метады выкарыстоўваць толькі тыя, якія адпавядаюць узросту аўдыторыі. Я не кажу катэгарычна, што выкладчыкі ВНУ не могуць працаваць у школе. Яны там працуюць і сумяшчаюць паспяхова выкладчыцкую работу са студэнтамі і работу са школьнікамі. Але для таго, каб атрымаць вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю, цяпер усім педагогам трэба здаваць кваліфікацыйны экзамен, а затым праз кожныя пяць гадоў свой прафесіяналізм пацвярджаць. Раней вышэйшую катэгорыю можна было атрымаць і, так бы мовіць, за выслугу гадоў: педагагічныя работнікі са стажам працы на пасадзе 10 і больш гадоў мелі права прэтэндаваць на вышэйшую катэгорыю ўвогуле без здачы кваліфікацыйнага экзамену. І, чаго ўтойваць, часам да пытання атэстацыі педагогаў падыходзілі на месцах выключна фармальна. Мы ў свой час апусцілі планку нашых патрабаванняў, таму ці варта здзіўляцца, што сёння вышэйшую і першую кваліфікацыйную катэгорыі ў нас маюць каля 70% ад агульнай колькасці педагогаў? І калі б мы не зацвердзілі новы парадак прысваення кваліфікацыйных катэгорый, то праз некалькі гадоў колькасць уладальнікаў першай і вышэйшай катэгорыі была б яшчэ большай. Паколькі моладзь не вельмі затрымліваецца ў школах, кадравы склад школьных педагогаў імкліва старэе.

Настаўнікі з Маладзечна:

**— Хацелі даведацца, ці зменіцца штосьці з даплатай за вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю. Пасля змянення парадку атэстацыі маладыя настаўнікі ў школе пасмейваюцца са старшых калег, якім трэба цяпер пацвярджаць сваю вышэйшую катэгорыю. А для вопытных настаўнікаў адмовіцца ад экзамену — тое ж самае, што распісацца ва ўласным непрафесіяналізме. Але крыўдна, што вышэйшая катэгорыя выконвае толькі ролю маральнага заахвочвання. І маладыя настаўнікі, калі і затрымаюцца ў школе, то наўрад ці будуць клапаціцца, каб яе атрымаць...**

— Мы імкнёмся выйсці на новы ўзровень аплаты працы педагогаў — прывязаць узровень заробкаў да ўзроўню і якасці работы, даць магчымасць плаціць больш тым педагогам, якія гэта заслугоўваюць. Ад ураўняльнага падыходу, які сёння прысутнічае, трэба, безумоўна, адыходзіць. І я не выключаю, што калі-небудзь побач будуць працаваць два настаўнікі, у якіх заробкі будуць адрознівацца ў разы. У рамках эксперыменту па ўкараненні новай галіновай сістэмы аплаты працы ўстаноўлены наступныя надбаўкі за кваліфікацыйныя катэгорыі: за катэгорыю «настаўнік-метадыст» — 115%, вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю — 100%, першую — 80% і другую — 70% ад тарыфнага акладу.

Хачу дадаць, што сістэма адукацыі — адна з самых дарагіх для бюджэту: фактычна кожны шосты рубель накіроўваецца ў нашу сферу. Таму мы павінны, з аднаго боку, імкнуцца да павышэння якасці работы, а з іншага, шукаць рэзервы для павышэння заробкаў унутры нашай галіны.

**Матэрыялы «прамой лініі» падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

***(Працяг тэмы — у наступных нумарах «Звязды».)***

■ Май на ўвазе

# «АДЗІНЫ БІЛЕТ» ДЛЯ ЎСІХ І КОЖНАГА

**Адным з самых цікавых экспанатаў багатай і разнастайнай экспазіцыі 7-й міжнароднай спецыялізаванай выставы «Транспарт і лагістыка» ў Мінску стала аўтаматызаваная сістэма аплаты за праезд у гарадскім транспарце пад назвай «Адзіны білет». Наш карэспандэнт сустрэўся з прадстаўнікамі групы стваральнікаў гэтай сістэмы на іх выставачным стэндзе.**

— Дзякуючы ўкараненню «Адзінага білета» стане магчымай аплата за адну ці некалькі паездак з дапамогай бескантактных картак ці sms-паведамленняў па мабільнай сувязі. Пасажыру будзе дастаткова набыць спецыяльную картку на пэўную колькасць паездак: ад адной да некалькіх дзясяткаў — у залежнасці ад яго жадання. Не выключаецца, што з часам будзе ўлічвацца і кіламетраж паездак — сістэма ў перспектыве дазволіць увесці дыферэнцыраваную аплату паездкі на пэўную адлегласць. А затым у салоне, напрыклад, аўтобуса пасажыру трэба будзе паднесці набытую картку да спецыяльнага прыбора (рыдара ці сканара назавіце, як хочаце) — і ваша аплата адразу зафіксуецца на картцы. Нябачна для вас паведамленне аб факце аплаты будзе перададзена ў працэсінгавы цэнтр Мінсктранса. Працэдура, як бачым, простая, — гаворыць **начальнік аддзела эксплуатацыі інфармацыйных сістэм і аптымізацыі перавозак на транспарце дзяржаўнага прадпрыемства «Інфармацыйна-вылічальны цэнтр авіяцыі» Міністэрства транспарту і камунікацый Віталь ШКУРАТАЎ**.

### У недалёкай будучыні кандуктары знікнуць, а вось кантралёры застануцца

Нагадаем, размовы аб неабходнасці калі і не прывесці аплату за праезд у аўтобусе, тралейбусе, трамваі і метро ў адпаведнасць з выдаткамі на ўтрыманне транспартных сродкаў, развіццё галіны, то хаця б, па магчымасці, мінімізаваць датацыі, вядуцца даўно. Транспартнікі патрабуюць рэгулярнага павышэння цэн на білеты. Улады ім рэкамендуюць выкарыстоўваць унутраныя рэзервы, зрабіць больш шчыльным кантроль, мадэрнізаваць транспартныя сродкі. Час ад часу ўзнікалі прапановы браць грошы за праезд па-новаму. І вось, відаць, пачаўся пераход ад слоў да справы.

У ролі ініцыятараў распрацоўкі сістэмы выступілі Міністэрства транспарту і камунікацый і кампанія мабільнай сувязі life:). У кожнага з іх свая задача. Напрыклад, life:) займаецца распрацоўкай аплаты за праезд праз мабільную сувязь, а «Інфармацыйна-вылічальны цэнтр авіяцыі» — пераводам наземнага транспарту, так бы мовіць, на новыя рэйкі спагнання аплаты за яго карыстанне. Гэтыя структуры пэўны час паасобку рухаліся да адной мэты, потым, нарэшце, сустрэліся і аб'ядналі намаганні. Партнёры, зразумела, дакладна вывучылі замежны досвед — у прыватнасці, Масквы, іншых мегаполісаў. Вынікам сумесных намаганняў пад патранажам Мінтранса з'явіўся «Адзіны білет». Ці, інакш кажучы, білет блізкай будучыні. Кажуць, што ўжо ў ліпені 2014 года сістэма будзе запушчана, як гаворыцца, у серыю. Тады, відаць, пачнуць знікаць кандуктары, бо патрэба ў іх паслугах адпадзе сама сабой. Аплата будзе весціся выключна праз электроніку — так плануецца ва ўсякім разе. А вось кантралёры застануцца. Вышукваць «зайцаў» яны будуць з дапамогай ручных электронных прыстасаванняў — так званых счытчыкаў: маўляў, прад'явіце вашу картку.




На погляд **менеджара закрытага акцыянернага таварыства «Беларуская сетка камунікацый» (належыць life:) Кірыла МІРОНЧЫКА**, «Адзіны білет» — гэта тое, што дазволіць значна ўдасканаліць работу грамадскага транспарту ў сталіцы і іншых гарадах, істотна спрасціць праезд у аўтобусе ці тралейбусе. Такая сістэма дазволіць аплату зрабіць у Гродне, а карыстацца білетам-карткай у выпадку неабходнасці ў Мінску. Вядома, усе дэталі дзеяння новай сістэмы цяпер цяжка вызначыць да дробязяў, зараз ідзе яе мадэрнізацыя, ёсць што дапрацаваць, палепшыць. Але «Адзіны білет» мае будучыню, бо яна адпавядае патрабаванням часу, упэўнены Кірыл Мірончык.

Ад адказу на маё прамое пытанне, колькі будзе каштаваць укараненне «Адзінага білета», суразмоўцы тактоўна ўхіліліся. Яны палічылі мэтазгодным адзначыць толькі тое, што абсталяванне для новаўвядзення будзе як айчынных вытворцаў, так і замежных пастаўшчыкоў.

**Леанід ТУГАРЫН**

■ Расклад на заўтра

# ХТО ВЫШЭЙ «РОСТАМ»?

## Для еўразійскай прасторы патрэбен свой рэйтынг ВНУ



**«Усе ўніверсітэты павінны быць рознымі. Самае горшае — паставіць універсітэты ў шарэнгу і сказаць, хто з іх вышэй ростам. Натуральна, можна параўноўваць, аналізаваць. Але аналіз павінен быць шырокім, навуковым і абапірацца на дзясяткі, а магчыма, і сотні крытэрыяў. А галоўным у ацэнцы ўніверсітэтаў павінны быць якасць адукацыі і запатрабаванасць іх выпускнікоў. Да таго ж рэйтынгі павінны ўлічваць нацыянальныя аспекты ўніверсітэцкай адукацыі», — такую думку выказаў рэктар Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта Віктар Садоўнічы, які наведаў Мінск у рамках правядзення Савета Еўразійскай асацыяцыі ўніверсітэтаў.**

Як лічыць Віктар Садоўнічы, пад эгідай Еўразійскай асацыяцыі ўніверсітэтаў можна было б распрацаваць новы незалежны рэйтынг з крытэрыямі, выканальнымі для ўніверсітэтаў еўразійскай прасторы.

Сёння ў Расіі адбываецца рэструктурызацыя сеткі вышэйшых навучальных устаноў. Неканкурэнтаздольныя ВНУ павінны будуць пакінуць рынак адукацыйных паслуг. Таксама ў Расіі распрацоўваецца прафесійны стандарт «Кіраўнік адукацыйнай арганізацыі» (кіраванне ў сферы адукацыі), які можа ўнесці значныя змяненні ў сістэму вышэйшай адукацыі. Згодна з адной прапановай, рэктарам ВНУ можа быць прызначаны любы топ-менеджар без акадэмічных рэгалій. Яе аўтары лічаць, што расійскім ВНУ трэба стаць паўнавартаснымі гульцамі на «полі» сусветнай адукацыйнай прасторы. Першы крок — траплянне ў верхнія радкі сусветных рэйтынгаў. Ёсць меркаванне, што адсутнасць там расійскіх ВНУ — гэта наступства неэфектыўнага кіравання.

Рэктар Расійскага ўніверсітэта дружбы народаў, экс-міністр адукацыі і навукі Уладзімір Філіпаў паведаміў, што ў Расійскай Федэрацыі адобраны эксперымент па прадастаўленні права вузкаму колу вядучых ВНУ і акадэмічных арганізацый самастойна прысуджаць навуковыя ступені і званні без Вышэйшай атэстацыйнай камісіі. Дарэчы, з 1 верасня, пасля ўступлення ў сілу новага закона «Аб адукацыі» аспірантура ў Расіі стала трэцяй ступенню вышэйшай адукацыі: цяпер яе можна скончыць, не абараняючыся, і атрымаць дыплом выкладчыка-даследчыка.

На думку міністра адукацыі нашай краіны Сяргея Маскевіча, у межах еўразійскай прасторы зараз актуальныя тры рэчы: акадэмічная мабільнасць студэнтаў, мабільнасць выкладчыкаў і вучоных, а таксама выпрацоўка новых падыходаў да ранжыравання ўніверсітэтаў.

— Як павысіць якасць адукацыі? Гэтае пытанне хвалюе сёння ўсіх. Як трансфармавацца ў агульную сусветную прастору, не губляючы лепшыя бакі нацыянальнай вышэйшай школы? Мы лічым, што вышэйшая адукацыя павінна працаваць перш за ўсё на нацыянальную эканоміку, на эканоміку заўтрашняга дня. Таму ў Беларусі сістэма вышэйшай адукацыі рэфармавалася эвалюцыйна, сінхронна са зменамі, якія адбываліся ў эканоміцы і сацыяльнай сферы, — падкрэсліў Сяргей Маскевіч.

Еўразійская асацыяцыя ўніверсітэтаў, якая была створана ў 1989 годзе як Асацыяцыя ўніверсітэтаў СССР, аб'ядноўвае сёння ў сваіх радах 128 ВНУ Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Грузіі, Казахстана, Кыргызстана, Латвіі, Малдовы, Расіі,Таджыкістана, Туркменіі, Узбекістана і Украіны. Асацыяцыя прытрымліваецца прынцыпу «элітнасці» і прымае не ўсіх ахвотных. З беларускіх ВНУ ў асацыяцыю ўваходзяць Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт, Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт і Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы.

**Надзея НІКАЛАЕВА**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Интеграл» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже административно-хозяйственного здания, об. пл. 149,3 кв.м, инвентарный номер 500/С-855, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 105, корп. 3.**

Начальная цена с НДС – 2 880 000 000 бел. руб.

Площадь земельного участка – 0,0386 га (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования).

Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

*Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 03.08.2013.*

Аукцион состоится **12.11.2013** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.11.2013** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: +375 17 280 36 37; (8029) 183 69 71.**



*К сведению акционеров ОАО «Современные розничные технологии»*

**22 октября 2013 года в 9 часов 00 минут по адресу: г. Минск, ул. Мирошниченко, 3 СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**ОАО «Современные розничные технологии»**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О реорганизации Общества.
2. Об утверждении условий выкупа акций на баланс Общества по требованию акционеров.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет проводиться по месту проведения собрания с 08 часов 00 минут до 08 часов 45 минут.

Акционер Общества принимает участие в работе собрания лично или через своего представителя, действующего на основании доверенности. Для регистрации на собрании необходимо при себе иметь паспорт, доверенность.

Дата формирования реестра владельцев ценных бумаг, на основании которого составляется список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров общества, – 17 октября 2013 года.

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться в рабочие дни с 09 часов 00 минут до 17 часов 00 минут с 14 по 21 октября 2013 года по адресу: г. Минск, ул. Мирошниченко, 3 (приемная) в день проведения собрания – по месту его проведения.

Орган, созывающий общее собрание акционеров ОАО «Современные розничные технологии», – наблюдательный совет.

УНП 690019195 *Наблюдательный совет. 017 261 00 89*



Белгазпромбанк Энергия твоего будущего!

**Совместное белорусско-российское ОАО «Белгазпромбанк»**

220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2. Телефон для справок: 120

**www.belgazprombank.by**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2013 г.**

ОАО «Белгазпромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2013 год | 2012 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 324 908,4 | 323 564,1 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 15 012,4 | 10 597,4 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 2 057 963,9 | 1 621 352,0 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 688 407,1 | 819 783,0 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 1 634 158,7 | 826 402,8 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 7 706 819,2 | 4 952 322,1 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 706 132,3 | 618 632,5 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 147,6 | 147,6 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 379 572,2 | 242 474,2 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | - | 229,4 |
| 12 | Прочие активы | 1111 | | 174 709,1 | 111 254,4 |
| 13 | **Итого активы** | **11** | | **13 687 830,9** | **9 526 759,5** |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | | 322 726,8 | 317 468,6 |
| 16 | Средства банков | 1202 | | 3 688 093,0 | 1 307 389,1 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | | 6 849 512,9 | 5 563 937,6 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 547 152,4 | 363 890,2 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | | 131 765,4 | 99 677,7 |
| 21 | **Всего обязательства** | **120** | | **11 539 250,5** | **7 652 363,2** |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | | 1 252 268,8 | 1 252 268,8 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | | 231 235,6 | 77 626,8 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 176 480,0 | 109 081,7 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | | 488 596,0 | 435 419,0 |
| 28 | **Всего капитал** | **121** | | **2 148 580,4** | **1 874 396,3** |
| 29 | **Итого обязательства и капитал** | **12** | | **13 687 830,9** | **9 526 759,5** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2013 г.**

ОАО «Белгазпромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2013 год | 2012 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 993 080,6 | 882 961,2 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 473 223,4 | 504 984,3 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 519 857,2 | 377 976,9 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 229 138,2 | 164 630,6 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 79 730,9 | 53 399,7 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 149 407,3 | 111 230,9 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 326,7 | 30 117,3 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (15 750,8) | 51 144,0 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 16 901,9 | 45 394,1 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 44 756,0 | 69 203,5 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 74 046,7 | 158 480,9 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 35 555,6 | 22 424,3 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 279 006,3 | 195 808,1 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 71 501,3 | 41 001,8 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 326 499,6 | 312 200,2 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | 46 596,0 | 34 270,5 |
| 17 | Прибыль (убыток) | 2 | | 279 903,6 | 277 929,7 |

**Председатель правления** **В.Д. Бабарико**

**Главный бухгалтер** **Т.М. Пивовар**

**Дата подписания: 4 октября 2013 г.**

**Данная отчетность опубликована на сайте ОАО «Белгазпромбанк» www.belgazprombank.by в разделе «Финансовые показатели».**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 8 от 24.05.2013, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100429079.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ГУ «Управление бытового обслуживания населения Минской области» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже права заключения договоров аренды объектов недвижимого имущества**

| Лот | Описание |
|---|---|
| Наименование Объекта (сведения о продаваемом имуществе) | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (ангар инв. № 0003), площадью 89,0 кв.м; здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (ангар инв. № 0004), площадью 93,5,0 кв.м |
| Местонахождение Объекта | г. Минск, ул. Инженерная, 8 |
| Земельный участок, на котором располагается Объект | Кадастровый номер 500000000002003473, площадь 0,9204 га (предоставлен в общую долевую аренду) |
| Срок договора аренды Объекта | 3 года |
| Начальная цена продажи права | 3 923 750 бел. руб. |
| Сумма задатка | 392 350 бел. руб. |
| Шаг аукциона | 10% |
| Размер ежемесячной арендной платы за сдачу в аренду Объекта | (0,5х0,6х3,0)х182,5=164,25 базовой арендной величины |
| Обременения, связанные с Объектом, земельным участком, на котором располагается Объект | Охранные зоны: ЛЭП, магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных инженерных сооружений. |
| Условия (при наличии) продажи Объекта аукциона | Использование объекта по целевому назначению. Содержание территории в соответствии с требованиями СНиП. |

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

